МІКАЛАЙ АРЭХ
ІГАР ПРАКАПОВІЧ

ГУТА ГОЛБІЯ

гісторыка-геаграфічны нарыс Галбейскага краю

Мінск
«Кнігазбор»
2007

www.kamunikat.org

УДК 94(476.6)(092)(081)
ББК 63.3 (4 Беи)
А 80

Арэх М., Пракаповіч І.
А 80 Гута-голбія: гісторыка-геаграфічны нарыс Галбейскага краю / Мікалай Арэх, Ігар Пракаповіч. — Мінск: Кнігазбор, 2007. — 88 с.
ISBN 978-985-6824-75-6.

Сумесная кніга гісторыка М. Арэха і географа І. Пракаповіча распавядае пра маляўнічы куточак Пастаўшчыны — Галбейскі край, дзе азёры, рэкі, лясы і палеткі ў спалучэнні з легендамі і паданнямі, мясцовымі гісторыямі і ўспамінамі людзей ствараюць запамінальныя вобразы-краявіды і чароўнай сілай вабяць да сябе тых, хто хоць аднойчы пабываў тут.

Выданне будзе карысным для гісторыкаў, краязнаўцаў, настаўнікаў, вучняў і ўсіх, хто цікавіцца прыродай і мінуўшчынай нашай зямлі.

УДК 94(476.6)(092)(081)
ББК 63.3 (4 Беи)

ISBN 978-985-6824-75-6

© Арэх М., Пракаповіч І., 2007
© Афармленне, ПУП «Кнігазбор», 2007

Гадзіннікі спыніліся даўно...
Маўчыць каменне вогнішча былога.
Па Галбяіцы ў Балтыку сплыло
Ўсё, што было тут з Богам і без Бога.

Мурог на поплаве — раскоша для кароў.
Што ім з таго, што гэта гарадзішча?
Тут водар траў — нібы з прадвечных сноў,
Паўсюль слядоў — як з чортава ігрышча.

Мінулы рух заснуў у камянях.
У нетрах памяці жыццё хавае скарбы,
І новы дзень — даўнейшага працяг —
У лёс людскі свае ўплятае фарбы.

Мы пастаім каля былых муроў...
Мы ціха пасядзім ля Галбяіцы...
І вельмі востра зразумеем зноў,
Што час паўзе,
бяжыць,
імчыцца...

Ігар Пракаповіч,
люты 1993 г.

www.kamunikat.org

Прадмова

Пастаўшчына — незвычайны па прыгажосці і надзвычай багаты сваёй культурна-гістарычнай спадчынай куточак Беларусі. Шматлікія і непаўторныя маляўнічыя азёры, павольныя, задумлівыя рэкі, густыя, амаль першабытныя, лясы — усё гэта цешыць вока і нараджае ў душы лагодныя пачуцці. Спалучэнне і перапляценне розных прыродных і гістарычных варункаў стварае на абсягах краю шмат адметных мясцін, куточкаў, дзе захаваўся і востра адчуваецца свой мясцовы, непаўторны каларыт, свае глыбінныя духоўныя плыні і традыцыі.

Адным з такіх яскравых куточкаў Бацькаўшчыны з'яўляецца Галбейшчына — утульная мясцовасць абапал ракі Галбяіца, дзе сярод лясных абшараў жывуць сваім жыццём вёскі Гута, Галбея, Манеўшчына, Харкі, Васілеўшчына, Аліхверы, Куніцкія, Трумпічы, Вольшнева. Людскія лёсы, нібы жыццёвы вадаток, звязвае плынь ракі Галбяіца; гісторыі асобных сем'яў, пераплятаючыся, утвараюць агульную тутэйшую гісторыю, якая кроплямі пралітага поту і крыві ўплятаецца ў гісторыю нашай краіны.

На жаль, родны край, яго прырода і гісторыя, мова і культура не толькі для знаёмых і суседзяў, але і для саміх карэнных жыхароў у многіх яго асаблівасцях з'яўляецца цікавай, але невядомай таямніцай. Так склалася, што нават у школах перавага ў навучанні аддадзена чужому, а не роднаму. І штудуюцца на ўроках войны ды рэвалюцыі ў Англіі, Францыі ды іншых краінах свету, а сваё, блізкае застаецца неабавязковым, не дужа важным і як бы непатрэбным. Але ж душа чалавека, яго лепшыя якасці вырастаюць з ведання, адчування і разумення роднага, бо родная зямля — гэта тое апірышча, тыя карэнні, якія дазваляюць ісці годна па жыцці, разумець яго сэнс і каштоўнасць.

«Любіць Радзіму — значыць ведаць яе» — так коратка і ёмка выказаў сутнасць патрыятызму вядомы рускі пісьменнік Канстанцін Паустоўскі. Гэтай формулы і прытрымліваліся аўтары кнігі, калі збіралі і

апрацоўвалі матэрыялы, звязаныя з прыродай і гісторыяй Галбейшчыны. Гутаркі з мясцовымі жыхарамі, праца з гістарычнай і геаграфічнай літаратурай, аналіз карт і фотаздымкаў — вось тыя крыніцы, якія далі асноўную інфармацыю пра асаблівасці тутэйшага краю. Мы стараліся ашчадна падыходзіць да ўсіх, нават самых дробных і быццам бы нязначных з'яў і падзей, каб і яны засталіся ў летапіснай гісторыі. Зразумела, што далёка не ўсе факты і фарбы мясцовага жыцця знайшлі сваё адлюстраванне ў сабраных матэрыялах, ды і ў тых, што пададзены ў кнізе, напэўна, ёсць недакладнасці і некаторыя скажэнні. На жаль, сведкаў падзей засталіся адзінкі, праверыць ступень аб'ектыўнасці іх успамінаў няма магчымасці, а памяць чалавечая мае натуральную ўласцівасць забываць.

Апрацоўваючы матэрыялы, усведамляеш, наколькі багацейшая была б наша культура, каб падобныя кнігі-памяткі, кнігі-хронікі былі напісаны ў XIX, пачатку XX ці хаця б у сярэдзіне мінулага стагоддзя, калі жылі па вёсках сівыя дзяды — сведкі даўняй гісторыі, захавальнікі традыцый, абрадаў, легенд і паданняў. Улічваючы няўмольную хаду часу, мы спяшаліся сабраць тую інфармацыю, якая яшчэ ёсць на памяці ў людзей, якую могуць расказаць жывыя сведкі гісторыі. Іншыя даследчыкі пойдуць далей за нас: яны будуць працаваць у архівах Глыбокага, Віцебска, Вільні, Мінска, Санкт-Пецярбурга, Масквы, Варшавы і знойдуць дакументы, якія пашыраць веды і ўяўленні пра асаблівасці жыцця людзей у маленькім куточку Пастаўшчыны на берагах ракі Галбяіца.

Напісанне кнігі было б немагчыма без дапамогі людзей, якія розным чынам далучыліся да збору і апрацоўкі матэрыялаў.

Аўтары выказваюць шчырую падзяку за цікавыя ўспаміны
Аляхновічу Віктару Аляксандравічу,
Балту Фёдару Фёдаравічу,
Бараноўскаму Эдуарду Эдуардавічу,
Гінько Антону Канстанцінавічу,
Балаю Уладзіміру Емяльянавічу,
Лукашэвіч Станіславе Канстанцінаўне,
Мішуту Мілецію Ягоравічу,
Пачкоўскаму Ананію Валяр'янавічу,
Янучкоўскай Ганне Вікенцьеўне,

www.kamunikat.org

а таксама вучням гуртка «СПАДЧЫНА»
Гуцкай сярэдняй школы
Арцем'еву Андрэю,
Казароўцу Пятру
за дапамогу ў зборы матэрыялаў.

Аўтары будуць удзячны ўсім, хто пажадае выказаць свае заўвагі і ўдакладненні па зместу кнігі, а таксама можа прапанаваць свае дакументы, матэрыялы, успаміны, якія датычацца не толькі Галбейшчыны, але і іншых рэгіёнаў Пастаўшчыны. Кніга выйшла, але збор звестак працягваецца.

Кантактныя тэлефоны:
Мікалай Арэх — 8 (02155) 59–521 (у Галбеі),
Ігар Пракаповіч — 8 (02155) 44–475 (у Паставах).

ГАЛБЕЙШЧЫНА: ПРЫРОДА І ЛЮДЗІ

Геаграфічнае становішча

Галбейшчына, прыгожая і маляўнічая часцінка зямлі беларускай, раскінулася абапал ракі Галбяіца ў атачэнні лясоў і балот на паўночным захадзе нашай краіны на ўсходзе Пастаўскага раёна. Адлегласць вёскі Голбія ад сталіцы Беларусі г. Мінска складае 146 км, ад абласнога цэнтра г. Віцебска — 190 км. Ад раённага цэнтра г. Паставы яна знаходзіцца на адлегласці 24,5 км.

Геаграфічныя каардынаты вёскі Голбія: 55°12' паўночнай шыраты, 27°11' усходняй даўгаты.



Галбейшчына на карце Пастаўскага раёна

Да Голбіі вядуць нядрэнныя пад'язныя шляхі: асфальтаваная шаша Варапаева-Полава і чыгуначнае адгалінаванне Варапаева-Друя.

www.kamunikat.org

Тэрыторыя выцягнулася ў напрамку з поўначы на поўдзень па даліне ракі Галбяіца. Тут знаходзяцца такія вёскі, як Гута, Голбія, Манеўшчына, Харкі, Аліхверы, Вайцяхі, Куніцкія, Трумпічы, Рагоўскія, Вольшнева.

Будова зямной кары і паверхні

Бадай кожны чалавек жадаў бы зазірнуць у нетры зямлі, каб даведацца, што ж там у глыбіні знаходзіцца? Якія горныя пароды складаюць тую паверхню, па якой мы ходзім? Геолагамі на Пастаўшчыне праведзены цікавыя даследаванні, якія даюць падставы ўявіць сабе будову зямной кары ў ваколіцах Гуты-Голбіі. Горныя пароды, што былі падняты з прабуранай каля Варапаева свідравіны, сведчаць пра даволі простую будову нетраў тутэйшай мясцовасці, калі параўноўваць яе з іншымі краямі Беларусі. На глыбіні 541 метр суцэльным маналітным пластом ляжыць трывалы крышталічны падмурак, які складзены ў асноўным гранітамі і гнейсамі. На ім таўшчынёй каля 250 метраў знаходзіцца слой старажытных марскіх адкладаў дэвонскага перыяду палеазойскай эры. Зверху ўсё гэта перакрыта тоўшчай асадкавых парод антрапагенавага перыяду кайназойскай эры, з якіх найбольш шматлікія — пароды водна-ледавіковага паходжання.

Такая будова дазваляе зазірнуць у глыбокую старажытнасць і паспрабаваць аднавіць гісторыю ўтварэння зямной кары ў ваколіцах сучаснай Гуты.

Вельмі даўно, 2,6–1,7 млрд гадоў таму, на месцы цяперашняй Пастаўшчыны існаваў вялікі акіян, на дне якога назапашваліся розныя адклады, адбываліся вывяржэнні вулканаў. Пазней утварыліся горныя сістэмы, вышыня якіх, як мяркуюць вучоныя, магла дасягаць некалькі кіламетраў. На працягу мільёнаў гадоў горы паступова разбураліся, тэрыторыя то апускалася і залівалася вадой, то зноў падымалася і станавілася сушай. Лічыцца, што найбольш глыбокія прагіны і моры існавалі ў паўночна-заходняй частцы Беларусі ў дэвонскі перыяд, калі ў асноўным і назапасіліся вялікія тоўшчы

марскіх адкладаў. Было гэта каля 400 млн гадоў таму назад. Пазней тэрыторыя паднялася, і надалей тутэйшая мясцовасць развівалася як суша.

Паверхня неаднаразова мяняла сваё аблічча, і адбывалася гэта ў асноўным з прычыны нашэсця ледавікоў. Лёд, а таксама патокі вады, якія ўтвараліся пры яго таянні, непазнавальна змянялі мясцовасць. Найбольшы ўплыў на тутэйшы рэльеф аказаў апошні, Паазёрскі ледавік, які магутным пластом пакрываў тэрыторыю сучаснай Гуты-Голбіі, спускаючыся на поўдзень да шыраты возера Нарач. У пачатку паазерскага часу некалькі разоў чаргаваліся хвалі цяпла і холаду, што прывяло да ўтварэння шырокай паласы тундры і вечнай мерзлаты. Толькі недзе 17-18 тыс. гадоў назад тэрыторыя была перакрыта магутным лёдам. Ён прасоўваўся на тэрыторыю Беларусі пяццю ледавіковымі патокамі. Паўз Пастаўскі раён ішоў дзісненскі паток, які рухаўся з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход.

Даліна Галбяіцы, па якой у час зледзянення рухаўся ледавік

www.kamunikat.org

Адзін з яго магутных языкоў, верагодна, марудна сцякаў на поўдзень па прадаліне ракі Галбяіца. З пацяпленнем клімата ледавік адступаў, але адступленне не было раўнамерным: яно перарывалася прасоўваннем на поўдзень, стаяннем. У часе такіх рухаў канчаткова сфарміраваліся Свянцянскія грады і, трохі пазней, Дзісненская нізіна. У целе ледавіка над сучаснай далінай Галбяіцы, верагодна, утварылася трэшчына, па якой пры таянні сцякалі патокі вады. Пра гэта сведчаць так званыя «зандравыя палі» — вялікія плошчы намытых пяскоў у ваколіцах Сяргеевічаў-Калітаў на паўднёвым усходзе Пастаўшчыны.

У браслаўскую стадыю зледзянення, калі мяжа лёду знаходзілася каля сучаснага Браслава, у паўночнай частцы Пастаўскага раёна знаходзіўся вялікі прыледавіковы вадаём, воды якога перакрывалі і мясцовасць вакол сучаснай Гуты. Ён утварыўся талымі водамі, якія сцякалі з ледавіка і збіраліся ў паніжэнні, падпруджаным Свянцянскімі градамі. Калі ж ледавік растаў зусім, то вадаём быў паступова спушчаны рэкамі Бірвіта, Мядзелка, Дзісна, Палавіца, Галбяіца, Заходняя Дзвіна.

Апошні ледавік пакінуў пасля сябе напамін у выглядзе чырванаватай горнай пароды — марэны з чырвона-бурымі валуннымі супесямі, суглінкамі і глінамі з праслоямі гравійна-галечнікавага матэрыялу і разнастайных пяскоў. Сям-там сустракаюцца вымытыя з марэны валуны.

Такім чынам, асноўныя рысы сучаснай паверхні ў ваколіцах Гуты-Голбіі сфарміраваліся каля 10 тыс гадоў таму ў час сыходу апошняга ледавіка. У цяперашнім рэльефе на захад і ўсход ад вёскі пераважаюць вялікія, месцамі забалочаныя, абшары выраўненай Дзісненскай нізіны, якія былі калісьці дном прыледавіковага вадаёма.

Дзісненская нізіна працягнулася ў межах Пастаўскага раёна з захаду на ўсход на 38 км, з поўначы на поўдзень — на 17 км. Адзнакі вышыні вагаюцца ад 140–135 м на поўдні да 119–125 м на поўначы. Адносная вышыня — 10–20 м. Пры гэтым больш-менш значныя перавышэнні (у дзесятак метраў) назіраюцца на далінах рэк. Каля Гуты ўзровень вады ў возеры знаходзіцца на абсалютнай

вышыні 124 метры над узроўнем Балтыйскага мора. На поўнач, у бок Дзісёнкі тэрыторыя павольна паніжаецца: у сутоках Галбяіцы і Палавіцы адзнака вышыні мае значэнне 120 метраў, гэта значыць, што на адлегласці каля 15 км мясцовасць панізілася на 4 метры. Калі на захад і ўсход ад Гуты паверхня вельмі выраўненая, што тлумачыцца раўнамерным назапашваннем асадкавых парод на дне прыледавіковага вадаёма, то ўздоўж рэчышча Галбяіцы сустракаюцца даволі значныя ўзгоркі і грады. Іх утварэнне звязана з дзейнасцю воднага патока, які цёк па трэшчыне ў ледавіку. У паглыбленнях гэтай ледзяной ракі збіраліся дробныя кавалачкі горных парод, якія пасля таяння ледавіка аселі на паверхню, утварыўшы даволі высокія ўзгоркі. Пазней гэтыя выспы былі моцна размытыя вадой, але часткова захаваліся да нашых дзён, утвараючы вельмі сімпатычныя краявіды. Разбуральная дзейнасць водных патокаў добра бачна каля вёскі Манеўшчына, дзе абрывы каля ракі маюць вышыню да 13 метраў. Берагавая лінія Дзісненскага прыледавіковага вадаёма праходзіла каля сучасных вёсак Харкі, Васілеўшчына, Казароўшчына.

Кліматычныя асаблівасці

Кліматычныя паказчыкі Галбейшчыны мала адрозніваюцца ад агульнараённых. Тып клімата тут — умерана-кантынентальны, і звязаны ён у першую чаргу з колькасцю цяпла, якое прыходзіць ад сонца. Награванне ж паветра залежыць ад яго вышыні над гарызонтам, працягласці дня і сонечнага ззяння. Розніца ў вышыні стаяння сонца летам і зімой у палудзень каля 47°, а ў працягласці дня — больш за 10 гадзін. У снежні назіраецца найменшая працягласць сонечнага ззяння — усяго 20-25 гадзін.

З вятроў над тэрыторыяй раёна пераважаюць зімой вятры паўднёва-заходняга накірунку, а летам — паўночна-заходнія і заходнія. Пераважанне заходніх вятроў з Атлантыкі робіць вялікі ўплыў на характар клімату. Зімой яны прыносяць павышэнне тэмпературы паветра, павелічэнне адноснай вільготнасці і выпадзенне ападкаў.

www.kamunikat.org



Летам яны паніжаюць тэмпературу. Вёскі Галбейшчыны, якія як бы схаваліся ў даліне ракі ў атачэнні з захаду і ўсходу вялікіх лясных масіваў, аказаліся захінутымі ад моцных вятроў гэтых накірункаў. Затое паўночны і паўднёвыя вятры пачуваюцца тут вельмі камфортна, бо даліна Галбяіцы амаль не стварае для іх перашкод і паветраныя масы лёгка праходзяць у мерыдыянальным напрамку.

Чаргаванне розных паветраных мас, цыклонаў і антыцыклонаў робіць надвор'е няўстойлівым. Асабліва характэрна гэта для вясны і восені, калі тэмпература, ападкі і вятры могуць памяняцца па колькі разоў на дзень.

Сярэднегадавая тэмпература складае каля +5,6С. Самым цёплым месяцам з'яўляецца ліпень (+17,3°), а самым халодным — студзень (–7,4°). Колькасць дзён з тэмпературай ніжэй 0° складае каля 130 дзён, а з тэмпературай вышэй за 0°С — 234 дні.

Набліжанасць да Атлантычнага акіяна, актыўная цыкланічная дзейнасць, значная вільготнасць паветра і воблачнасць спрыяюць выпадзенню вялікай колькасці ападкаў. У сярэднім за год іх выпадае каля 650–700 мм. У асобныя гады бываюць значныя адхіленні ад сярэдніх дадзеных. Найбольш ападкаў бывае ў ліпені-жніўні, найменш — у студзені-лютым, хоць часцей дажджы і снягі ідуць



восенню і зімой. На працягу года налічваецца да 190 дзён з ападкамі.

Снежнае покрыва стала з'яўляцца на палях звычайна ў пачатку снежня, хоць бываюць гады, калі снег выпадае і ў лістападзе, і ў кастрычніку, і нават у верасні. Ляжыць белая коўдра на зямлі каля 100-110 дзён і знікае звычайна ў канцы сакавіка. Таўшчыня снегу дасягае 30 см, а ў асобныя гады намятае сумёты да метра і больш.

Заснежаная дарога праз Варапаеўскую Дачу («Капанка»)

www.kamunikat.org

Рэкі і азёры

Вада — аснова жыцця. Гэта аксіёма вельмі падыходзіць да Галбейшчыны. З'яўленне ў тутэйшай мясцовасці людзей і ўтварэнне паселішчаў непасрэдна звязана з вадой. Рака Галбяіца сталася тым прыродным аб'ектам, які прывабіў сюды першажыхароў.

У літаратуры і на геаграфічных картах ужываюцца розныя формы назвы гэтай ракі. На Пастаўшчыне, бадай, няма больш такога прыроднага аб'екта, які б меў такое дакладна не акрэсленае напісанне наймення. Голбіца, Галбіца, Голбеіца, Галбяіца, Голбія, Галбея, Галубейка — у такіх формах можна сустрэць назву ракі ў розных крыніцах. Гэта разнастайнасць з'яўляецца вынікам таго, што прыйшло найменне з глыбокай старажытнасці з моў народаў, якія ў далетапісную эпоху насялялі тутэйшую мясцовасць. Як сведчаць на-

Разводдзе на Галбяіцы

вукоўцы, гэта маглі быць плямёны фіна-вугорскай моўнай групы, далёкія продкі і родзічы сучасных фінаў, эстонцаў, карэлаў, комі, комі-пермякоў, удмуртаў, мардвы і некаторых іншых паўночных народаў. Словы тых старажытных людзей засталіся ў назвах рэк, азёр, некаторых населеных пунктаў. А паколькі іх мова моцна адрознівалася ад цяперашняй беларускай, то дайсці да сутнасці іх, расшыфраваць закладзены ў назвах сэнс даволі складана. Але паспрабуем вызначыцца хоць з магчымымі версіямі назвы «Галбяіца»

(у далейшым будзем прытрымлівацца гэтай формы, бо так называюць раку мясцовыя жыхары). Паколькі яна знаходзіцца ў арэале распаўсюджання водных фіна-вугоркіх найменняў, то лагічна будзе шукаць тлумачэнне ў мовах паўночных народаў. З другой часткай быццам бы ўсё зразумела: «я» і «бія» — гэта формы, якія маюць значэнне «рака». З першай часткай назвы больш складана, бо сэнсава адпаведных слоў аснове «гал» у фіна-вугорскіх мовах знайсці не ўдалося. Аднак ёсць такое беларускае слова «гала», якое азначае нізкую забалочаную мясцовасць, балота з купінамі. Верагодна, яно было запазычана з фіна-вугорскіх моў, дзе сустракаецца аснова «кал» у значэнні «вялікае, чыстае, бязлесае балота, якое парасло травой і мохам». Як бачым, сэнсавае значэнне слоў аказваецца вельмі блізкім. У выніку можна растлумачыць назву «Галбея», як «балотная рака» або «рака, якая цячэ сярод балот». Калі ж адштурхнуцца ад формы назвы вёскі «Албея», то ў фіна-вугорскіх мовах можна знайсці аснову «ала» з сэнсавым значэннем «мясцовасць» і «ніз», «нізкі». З гэтага вынікае і другое, падобнае на першае, тлумачэнне назвы «Галбея» — «нізкая (ніжняя) рака», або «рака, якая цячэ па нізіне». І адно, і другое тлумачэнне прыдатна адлюстроўваюць прыродныя асаблівасці ракі.

Галбяіца з'яўляецца самай доўгай ракой у межах Пастаўскага раёна: яна працягнулася на 51 км з поўдня на поўнач ад Гараноўшчыны да Рымкоў. Агульная ж яе даўжыня складае 63 кіламетры. Вытокі ракі знаходзяцца за паўкіламетра на паўднёвы захад ад вёскі Глінскія. На працягу 5 км яна цячэ па тэрыторыі Мядзельскага раёна, потым — па Пастаўскім і Шаркаўшчынскім раёнах. У верхнім цячэнні называецца Заражанка. Гэта назва ўтворана ад старажытнаславянскага слова «зараза» ў сэнсе «зараснік», «моцна перасечаная мясцовасць», што дакладна адлюстроўвае характар ракі ў вярхоўі, дзе рэчка мае звілістае рэчышча, прымае шмат прытокаў: ручаёў, каналаў, рэчку Смычыцу. Ніжэй Дунілавічаў шырыня Заражанкі павялічваецца да 12 м пры сярэдняй глыбіні 0,7 м. Пашырэнне і нязначнае спрамленне рэчышча адбылося дзякуючы шэрагу запруд у в.Алешына, г.п.Варапаева, в.Кейзікі. Ніжэй в.Васілеўшчына рэчышча звужаецца да 6-8 м. Каля в.Гута рака ўтварае два шы-

www.kamunikat.org

рокія плёсы — азёры Гуцкое і Галбейскае. Ніжэй вёскі Голбія рэчка мае назву Галбяіца. Шырыня яе павялічваецца да 12–15 м, глыбіня — да 1–2 м. Цячэнне запаволенае, хуткасць плыні мае значэнні каля 0,2 м/с. Падзенне ракі ў межах раёна складае 52 м, а ўхіл — 1 м/км. Даліна Галбяіцы, асабліва ў ніжнім цячэнні, шырокая, на асобных участках дасягае 150 метраў. Сярэднегадавы расход вады ў вусці вагаецца каля адзнакі 6,6 кубічных метраў за секунду.

У ваколіцах Гуты-Голбіі рака прымае некалькі сваіх буйнейшых прытокаў. Пасля ледавіка ў гэтай мясцовасці засталося значнае паглыбленне, якое запоўнена Галбейскімі азёрамі, куды і нясуць воды ручаі і рачулкі. З захаду гэта Амшара, Мядзель, Шурыца, з усходу — Чортка і Карнееўка. Рачулкі жывяцца дажджамі, талымі і падземнымі водамі. Шырока разліваюцца вясной падчас ледаходу, а таксама летам і восенню ў час моцных ліўняў. Берагі пераважна нізінныя са слаба выпрацаванымі далінамі.

Від на возера Гуцкое

Ручай Амшара бярэ пачатак на паўночнай ўскраіне Варапаева, каля былой вёскі Бараўкі, і цячэ ў напрамку на поўнач, упадаючы з захаду ў возера Гуцкое. У «Блакітнай энцыклапедыі Беларусі» ручай памылкова называюць Цімара. Назва «Амшара» мае славянскае паходжанне і ўтворана ад асаблівасці мясцовасці, па якой працякае: «амшара» (бел.) — «мохавае балота». Сапраўды, амаль усё рэчышча знаходзіцца ў лясным забалочаным масіве.

Заходней р. Амшара амаль паралельна ёй на адлегласці каля 2 км нясе свае воды ручай Мядзель. Гэта назва сустракаецца на польскіх картах, у сучасных даведніках і картах ён фіксуецца без назвы. «Мядзель» — тэрмін фіна-вугорскага паходжання: «метс» (эст.), «metce» (фін.) — «лес», «ель» (комі) — «лясны ручай, рэчка». Такім чынам, «Мядзель» — «лясная рэчка», што вельмі дакладна адлюстроўвае яе асаблівасці: на большай частцы яна цячэ таксама па лясістай забалочанай мясцовасці. Пачатак Мядзель бярэ недалёка ад Варапаева, працякае праз вёскі Мядзелка, Гута, былы засценак Хардакова і ўпадае ў возера Галбейскае (Галбея Пярэдняя). Каля Хардакова зроблена запруда, перад якой утварыўся невялікі стаў.

Адным з найбольшых левых прытокаў Галбяіцы з'яўляецца рака Шурыца. Корань яе назвы таксама фіна-вугорскі: «шор»(комі) — «ручай», «шур»(удм.) — «рака». Пачынаецца яна за 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі Карпавічы, цячэ праз Старадворскае возера і стаў. Ніжэй возера рэчышча ракі каналізавана. У сярэднім і ніжнім цячэнні Шурыца блукае па вялікім лясным забалочаным масіве Варапаеўскай дачы, упадаючы ўрэшце ў раку Галбяіцу паўночней вёскі Голбія. Рака мае даўжыню 20 кіламетраў і плошчу вадазбору каля 70 км^2.

Амаль насупраць Шурыцы ў Галбяіцу ўпадае яе правы прыток Чортка (Чэртка), якая мае даўжыню 14 кіламетраў і збірае ваду з плошчы ў 51 км^2. Выцякае яна з возера Рудзіца каля вёскі Ляхаўшчына і, як і іншыя прытокі, у ніжнім цячэнні прабіваецца праз забалочаную лясістую мясцовасць. Каля вусця на правым беразе Чорткі знаходзіцца вялікі комплекс курганных пахаванняў. Назва ўтворана ў глыбокай старажытнасці і таксама мае фіна-вугорскае пахо-

www.kamunikat.org



Схема глыбінь Гуцкога возера (склаў М. Арэх)

джанне: на мове комі «чэр» — «прыток ракі». Напэўна, назва прайшла наступную трансфармацыю: «чэр» — «чэрка» — «чэртка»-«чортка». Фіна-вугорская назва «абрасла» славянскім рачным канчаткам, а потым у незразумелую славянам назву дадалася літара «т» — атрымалася «чортава рака».

Яшчэ адзін прыток Галбяіцы — рака Карнееўка. Яе вытокі знаходзяцца каля вёскі Ласькія, а вусце — каля Куніцкіх. Мае даўжыню 10 кіламетраў з плошчай басейна 20 км^2. Цячэ паралельна Чортцы па таму ж лясному забалочанаму масіву.

Каля Гуты рэчышча Галбяіцы значна расшыраецца, утвараючы два праточныя возеры. З назвамі гэтых вадаёмаў, як і з назвай ракі, існуе пэўная нявызначанасць. На сучасных тапаграфічных картах возера каля вёскі Голбія называецца амаль таксама як і паселішча — Галбея, а возера каля Гуты — Задняе. На польскай карце — (адпаведна) Галбея Пярэдняя і Галбея, у даведніку «Блакітная энцыклапедыя Беларусі» — Галбея Паўночная і Галбея Паўднёвая. Мясцовыя жыхары называюць азёры «Галбейскае» і «Гуцкое», што найбольш адпавядае сучаснасці і канкрэтызуе іх месцазнаходжанне. Гістарычныя ж назвы зафіксавалі працэс засялення тутэйшай мясцовасці: першажыхары рухаліся ад вусця Галбяіцы супраць цячэння, паступова асвойваючы берагі ракі. Таму і атрымалася возера Галбейскае Пярэднім, а Гуцкое — Заднім.

Галбейскае возера знаходзіцца на поўдзень ад вёскі Голбія. Мае плошчу воднага люстра 0,35 км^2. У даўжыню яно выцягнулася з поўначы на поўдзень на 1 кіламетр, у шырыню — каля 480 метраў. Берагавая лінія даволі звілістая, даўжынёй 2,6 км. Схілы азёрнай катлавіны маюць вышыню 6-8 метраў, у асноўным яны ўсе разараныя. Берагі нізкія, месцамі забалочаныя. На паўночным беразе возера знаходзіцца старажытнае гарадзішча, а далей, каля вёскі, — селішча.

Амаль такое ж па плошчы (0,36 км^2) і возера Гуцкое. Яно выцягнулася з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход на 1,65 км маючы шырыню да 420 метраў. Схілы катлавіны — да 6 метраў. На захадзе і паўночным усходзе берагі разараныя, на паўднёвым захадзе да берагоў падступае лес. Абодва возеры багатыя на рыбу; у летні час

Возера Галбейскае

на іх многа вадаплаўнай птушкі.

На адлегласці 2 км на поўнач ад Галбейскага ляжыць возера Трумпіцкае. На карце XIX стагоддзя яно падпісана як Тумпічы. Возера мае плошчу 0,44 км^2, выцягнуўшыся з паўднёвага захаду на паўночны ўсход на 1,37 км паміж вёскамі Вайцяхі і Аліхверы. Шырыня возера трохі большая за паўкіламетра. Найбольшыя глыбіні дасягаюць 4 метраў. Схілы катлавіны пераважна разараныя, маюць вышыню 6-8 метраў, на паўночным усходзе паніжаюцца да 2–3 метраў.Месцамі прасочваецца тэраса вышынёй 1,2–1,4 метры. Берагі нізкія, пясчаныя і пясчана-галечныя, пад хмызняком, месцамі на поўдні сплавінныя. Дно возера плоскае, ілістае, на невялікім участку каля ўсходняга берага пясчанае. Зарастае надводнай расліннасцю да глыбіні 1,2–1,5 м. Назва возера паходзіць, верагодна, з фінавугорскіх моў. Мансійскае «туман», «тумэн» — азначае «пойменнае возера, праточнае возера». Трумпіцкае возера, сапраўды, ляжыць у паніжэнні; мае нізкія, месцамі сплавінныя берагі пад хмызняком. Другая частка назвы «пі» ўяўляе сабой аглушанае «бі» ў значэнні «вада» .

Рачулка Амшара

За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі Трумпічы знаходзіцца яшчэ адно невялікае возера Ціменец (Ціменцы), якое на карце XIX стагоддзя запісана як «Олишево». Яно мае плошчу ўсяго каля 0,1 км^2 пры даўжыні 430 м і шырыні 270 метраў. Схілы катлавіны ўзвышаюцца над воднай паверхняй на 2–6 метраў, разараныя. Берагі нізкія, часткова забалочаныя. Пойма даволі моцна забалочана, паросшая хмызняком. З возера выцякае ручай у раку Галбяіца.

Глебы, расліннасць, жывёльны свет

Галбейшчына знаходзіцца ў зоне змешаных лясоў, для якіх занальнымі глебамі з'яўляюцца дзярнова-падзолістыя. Пад уплывам прыродных фактараў (раўнінны рэльеф, умераны клімат, рыхлыя горныя пароды, занальная расліннасць і жывёльны свет, дзейнасць чалавека) у тутэйшай мясцовасці развіваюцца тры асноўныя глебаўтваральныя працэсы — падзолісты, дзярновы і балотны ў чыстым выглядзе або ў спалучэнні. Таму і атрымалі найбольшае распаўсюджанне такія тыпы глебаў, як дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя, поймавыя (алювіяльныя) забалочаныя, тарфяна-балотныя. Большая частка паверхні занята глебамі з павышаным утрыманнем вільгаці.

Па механічнаму складу пераважаюць цяжкія гліністыя і суглінстыя глебы. Яны з'яўляюцца самымі ўрадлівымі, бо добра трымаюць вільгаць, арганічныя і мінеральныя ўгнаенні. Адмоўныя якасці: лёгка разбураюцца ліўневымі дажджамі і расталымі водамі вясной, маюць павышаную кіслотнасць і патрабуюць вапнавання, вясной у іх карацейшы, чым у супясчаных глебаў, перыяд для апрацоўкі і сяўбы. На Галбейшчыне яны пераважна знаходзяцца пад ляснымі масівамі. Па далінах рэк часцей сустракаюцца пясчаныя і супясчаныя глебы, а ў месцах з празмерным увільгатненнем — тарфяна-балотныя.

Асноўнымі тыпамі натуральнай расліннасці з'яўляюцца лясная, лугавая і балотная. Лясы — другая пасля рэк і азёр адметнасць тутэйшага краю. Фактычна, даліна Галбяіцы — гэта вузкая паска сушы, якая асвоена людзьмі сярод вялізнага лясного масіву. На захад ад яе ляжыць вялікае зялёнае мора — Варапаеўская Дача. Яна мае плошчу больш за 80 км^2. Знаходзіцца ў міжрэччы Палавіцы і Галбяіцы. Каля паловы гэтага лясного масіву забалочана. У цэнтральнай частцы Дачы (урочышча Шурыца) пераважаюць змешаныя ялова-бярозавыя насаджэнні. На сушэйшых месцах у паўночнай і заходняй частцы месца елкі займае сасна. Ва ўрочышчы Зайцова, што знаходзіцца ля Варапаева, сустракаюцца асіннікі. У асноўным лясы Варапаеўскай Дачы спелыя, сярэдняя вышыня дрэў

www.kamunikat.org

22–24 м, таўшчыня — 25-30 см. Значная частка лясного масіву раней выкарыстоўвалася як ваенны палігон.

На ўсход ад рачной даліны лясы пераважна саснова-бярозаваяловыя. У падлеску, як і ў іншых лясных масівах, сустракаюцца такія пароды дрэў як рабіна, ясень, клён, вольха, дуб, вяз, ядловец, ліпа, таполя, вярба, чаромха, дзікія яблыні і грушы.

Адметнасць Галбейшчыны — густыя змешаныя лясы

З кустоў у лясах растуць барбарыс, парэчкі, ірга, маліны, ажыны, ружа, шыпшына, арэшнік, крушына, жасцёр, ваўчаягада, плюшч, бузіна, каліна і іншыя.

З кусцікаў і паўкусцікаў найчасцей сустракаюцца талакнянка, багун, верас, багноўка, брусніцы, чарніцы, буякі, журавіны, паслён, чабор, лінея, бурачок.

Паўсюдна растуць дзераза, хвашчы, папараці, імхі і лішайнікі.

На Галбейшчыне можна пабачыць розныя тыпы лугоў. Сухадольныя лугі размешчаны на павышаных элементах рэльефу і часцей сустракаюцца на ўзгорках. Травастоі там нізкарослыя і зрэджаныя, пераважаюць булаваносец сіваваты, аўсяніца авечая, мятліца тонкая, галадок шматгадовы, ястрабок валасісты, гладун гладкі, шчаўе малое, расходнік едкі і іншыя. Але ўчасткі сухадольных лугоў сустракаюцца рэдка, бо па далінах рэк ва ўмовах павышанага ўвільгатнення развіваюцца лугі нізінныя і поймавыя (заліўныя).

Нізінныя лугі размешчаны ў глыбокіх паніжэннях водападзелаў і надпоймавых тэрас. Травастоі злакавыя (вострыца дзірваністая, мятліца сабачая і белая, метлюжкі балотны і звычайны, пажарніца шараватая), асаковыя са значнай прымессю вільгацелюбнага разнатраўя.

Поймавыя (заліўныя) лугі нешырокай паласой працягнуліся з поўначы на поўдзень па даліне Галбяіцы. У месцах сярэдняга ўвільгатнення пераважаюць злакі, у найбольш вільготных — злакі і асака. Такія лугі з'яўляюцца каштоўнымі сенакоснымі ўгоддзямі і пашай

Балотная расліннасць на Галбейшчыне прадстаўлена расліннасцю пераважна пераходных і нізінных балот. З дрэў растуць хвоя, бяроза, вольха; з кустоў — розныя віды вербаў, нізкая бяроза; з травяністых раслін — вятроўнік, бабок, шабельнік, хвошч, папараць, скрыпень, пажарніца, трыснёг, мятліца (белая), мурожніца чырвоная, метлюжок лугавы, асака, імхі. Для моцна абводненых балот характэрны зараснікі трыснягоў, хвашчоў, асакі.

Жывёльны свет Пастаўскага раёна налічвае каля 400 відаў пазваночных і некалькі дзесяткаў тысяч беспазваночных жывёл. Усе яны сустракаюцца на Галбейшчыне.

Сучасная фауна млекакормячых прадстаўлена 6 атрадамі: насякомаедныя (10 відаў), лятучыя мышы (15 відаў), драпежнікі (16 відаў), парнакапытныя (6 відаў), зайцападобныя (2 віды), грызуны (24 віды). Сярод іх і 4 акліматызаваныя: янотападобны сабака, янотпаласкун, амерыканская норка, андатра.

Паўзуноў налічваецца 7 відаў, сярод якіх па 3 віды яшчарак і змеяў. Земнаводныя прадстаўлены 2 відамі трытонаў і 10 відамі бясхвостых (жабы, рапухі і да т. п.)

З птушак на тутэйшай тэрыторыі сустракаюцца прадстаўнікі 302 відаў.

Пазваночныя групуюцца ў прыродныя комплексы лясоў, палёў і лугоў, узбярэжжаў вадаёмаў, балот, паселішчаў.

www.kamunikat.org

Фауна сасновых лясоў, асабліва лішайнікавых і верасовых, аднастайная таму, што ў іх мала корму для жывёл і няма падлеску — укрыцця ад ворагаў. Тут нярэдка селіцца ліс, барсук, лясная рыжая палёўка, звычайная буразубка, вавёрка; на ўзлесках і ў зрэджаных барах трапляюцца заяц-русак, крот. У хвойніках каля балот бываюць казулі, ласі, дзікі.

З птушак у хваёвых лясах можна сустрэць глушцоў, цецерукоў, дзятлаў, пішчух, соек, пеначак, мухаловак. Небагатая ў барах фауна паўзуноў і земнаводных: на высечках жыве порсткая яшчарка, на ўзлесках і палянах — вераценніца ломкая і жывародная яшчарка, у вільготных зацененых мясцінах — вуж і гадзюка, шэрая рапуха, травяная і вастрамордая жабы.

Жывёльны свет ельнікаў значна багацейшы, бо там больш корму, лепшыя ахоўныя ўмовы. Сустракаюцца крот, буразубкі, лясныя рыжыя палёўкі, лясная і жаўтагорлая мышы, ёсць лясная куніца, на ўзвышшах і сухіх месцах — ліс і барсук. Зімой ельнікаў трымаецца заяц-бяляк, мясцін з густым падлескам — дзік, лось, воўк. Багатае птушынае насельніцтва: пашыраны крыжадзюб-яловік, рабчык, чорны дзяцел, вераб'іныя сойкі, сініцы, пеначкі, дразды. Водзяцца жывародная яшчарка, вуж і гадзюка, ломкая, травяная, вастрамордая жабы, вераценніца.

Багаты жывёльны свет шыракалістых і мяшаных лясоў. Тут сустракаюцца лятучыя мышы, мышападобныя грызуны, казулі, ласі, дзікі, тхары, лясныя куніцы, барсукі, ваўкі, янотападобныя сабакі.

Спецыфічны жывёльны свет лугоў і палёў. Тут жывуць зайцы-русакі, лісіцы, гарнастаі, ласкі, краты; з птушак — перапёлка, жаўрук, шэрая курапатка, драч і інш.

На ўзбярэжжах вадаёмаў асабліва шмат птушак: кулікі, чайкі, качкі, чаплі, бугаі, чэпікі, у хмызняках — вераб'іныя. З млекакормячых каля вадаёмаў жывуць бабёр, андатра, норка, выдра, вадзяны пацук. У рэках і азёрах пашыраны шчупак, акунь, плотка, лешч, лін, карась, гусцяра, пячкур, чырванапёрка.

Некаторыя віды жывёл і птушак адносяцца да паляўніча-прамысловых. Па ліцэнзіях вядзецца паляванне на лася, дзіка, казулю, аленя, бабра і выдру. Паляўнічым дазваляецца таксама здабываць у вызначаныя тэрміны вавёрак, зайцаў, лісаў, норак, тхароў, куніц, гарнастаяў.

Паселішчы і насельніцтва

Першым паселішчам, якое ўзнікла на беразе Галбейскага возера, была вёска **Голбія**. На радзівілаўскай карце 1613 года яна нанесена пад назвай «Олбія», на карце Ашмянскага павета канца XVI стагоддзя, якая складзена на падставе гістарычных крыніц, — «Албея».

Рака «Глбіца» згадваецца ў прывілеі Вялікага князя Вітаўта Зяновію Братошычу пад 1414 годам, дзе пацвярджаліся правы магната на землі паміж Глыбокім і Паповічамі. Улічваючы тое, што каля возера і ракі знаходзіцца старажытнае паселішча і селішча, то відавочна, што першыя людзі тут пасяліліся вельмі даўно. Можна выказаць меркаванне, што ўжо на мяжы эр пры беразе возера пражывала сталае насельніцтва.

У сярэднявеччы Голбія была даволі значным па памерах і колькасці жыхароў населеным пунктам Ашмянскага павета. На карце 1800 года паказана, што ў вёсцы знаходзіўся храм.

Аднак акружанасць забалочанымі лясамі і адсутнасць прыдатных земляў для вядзення сельскай гаспадаркі стрымлівалі развіццё гэтага паселішча.

Гута і Голбія

www.kamunikat.org

У пачатку XX стагоддзя існаваў фальварак Галбея з 59 жыхарамі, які належаў К. Пшаздзецкаму, і вёска Голбія, у якой пражывала 140 чалавек (70 мужчын і 70 жанчын). З цягам часу колькасць людзей павялічвалася. «Пры Польшчы» ў 1923 годзе ў 30 дварах пражывала 168 вясковых жыхароў і 33 — у фальварку. Найбольшую ж колькасць насельніцтва мела вёска ў 1963 годзе — 247 чалавек. У канцы XX стагоддзя Голбія пачала драбнець. У 2001 годзе налічвалася 77 двароў, 136 жыхароў.

Гута ўзнікла значна пазней за суседнія вёскі. Яе гісторыя пачынаецца толькі з 1905 года, калі купец Каган адкупіў у графа Пшаздзецкага ўчастак лесу і ў 1913 годзе пабудаваў шклозавод. Паступова вакол завода пачалі будавацца людзі. Развіццё вытворчасці патрабавала новых рабочых рук, і таму ў вёсцы хутка расла колькасць жыхароў. У 2001 годзе Гута была адным з буйнейшых населеных пунктаў Пастаўскага раёна: у ёй налічвалася 273 хаты і пражывалі 742 чалавекі. Нерытмічнасць работы, а потым і закрыццё завода ў пачатку XXI стагоддзя стварыла шмат праблем мясцоваму насельніцтву.

Назва вёскі тлумачыцца проста. Славянскі прамысловы тэрмін «гута» паходзіць ад нямецкага «hutte» ў значэнні «пабудова», «плавільня», «металургічны завод». У Беларусі гэты тэрмін адносіўся пераважна да шклозаводаў. Першапачаткова вёска называлася «Гута-Голбія», што зафіксавана на польскіх картах, і мела значэнне «шклозавод у Голбіі». Пазней назва спрасцілася і засталася толькі першая частка.



Аўтобусны прыпынак у Гуце

У паўднёвай частцы Гуты знаходзіцца мясцовасць, якая называецца «**майдан**». Ва ўкраінскай мове гэта слова азначае гарадскую плошчу, у Беларусі яно мела трохі іншы сэнс: майданам называлі пляцоўку, звычайна ў лесе, дзе вялася нейкая прамысловая дзейнасць, пераважна нарыхтоўка смалы. Паводле слоў жыхаркі в. Гута Балай Соф'і, на майдане раней знаходзілася смалакурня.

На заходняй ускраіне вёскі ёсць мясцовасць, якая называецца **Хардакова**. Раней гэта быў засценак, дзе жылі дзве сям'і. Вайной у час карнай аперацыі фашыстамі пабудовы былі спалены, а жыхары расстраляныя. (Падрабязней — у гістарычнай частцы кнігі). Паходжанне назвы канчаткова не высветлена. Існуе версія, што ўтворана яна ад слова «хорда», якім быццам бы характарызаваўся зямельны надзел, але ў даведніках такі тэрмін не сустракаецца.

Улічваючы, што Галбейшчына — гэта арэал распаўсюджвання фіна-вугорскіх назваў, можна прапанаваць версію ўтварэння наймення ад пермскай асновы «кар» у значэнні «гарадзішча», «умацаванае месца». Гэта ж аснова можа ляжаць і ў корні назвы вёскі

Стаў у Хардакове

www.kamunikat.org

«Харкі», дзе «-кі» — гэта тыпова славянскі канчатак, характэрны для невялікага паселішча, а ў аснове «кар» першы гук лёгка аглушаецца і замяняецца на «х». Гэта тлумачэнне не выключае іншыя версіі, улічваючы тое, што падобныя назвы сустракаюцца і на Украіне (прыгадайма «Харків»).

Вёска ж **Харкі** ў 1873 годзе належала Райнольду Тызенгаўзу, пазней перайшла да яго пляменніка К. Пшаздзецкага. Тады ў вёсцы пражывала 29 чалавек. У пачатку XX стагоддзя (1909 г.) ў Харках мелася 6 двароў, а ў 15 сем'ях налічвалася 105 жыхароў. У мінулым стагоддзі колькасць двароў павялічвалася, але сем'і памяншаліся. У выніку ў 1963 годзе ў вёсцы было 28 двароў і 97 жыхароў, а ў пачатку XXI стагоддзя — 20 двароў і 36 насельнікаў.

Вёска **Манеўшчына** ляжыць на адлегласці каля 2 км на паўднёвы ўсход ад Гуты. Гэта невялікае паселішча было заснавана, напэўна, вельмі даўно, верагодна, адначасова з засяленнем берагоў Галбейскага возера. Назву вёскі можна растлумачыць таксама з фінавугорскіх моў, дзе аснова «мань» азначае «малы», «маленькі». Як яна стасуецца з мясцовасцю? Вядома, што рака Заражанка-Галбяіца каля Манеўшчыны значна звужаецца, што, верагодна, і было заўважана старажытнымі людзьмі, якія назвалі гэты ўчастак ракі «манья», што значыць «малая рака». Пазней назва была зменена славянамі, але захавала ўласцівасць абазначэння мясцовасці, бо фармант «-шчына» характарызуе аб'ект як нейкую тэрыторыю. Паселішча, якое тут існавала, атрымала назву мясцовасці. Сама вёска заўсёды была невялікая. У 1873 годзе тут пражывала ўсяго 6 чалавек, у 1905–43. Зараз вёска фактычна знікла. Калі ў 1963 годзе яшчэ налічвалася 15 двароў і 49 жыхароў, а ў пачатку XXI стагоддзя заставалася 4 двары і 5 жыхароў, то цяпер у паселішчы ніхто стала не жыве.

Вёскі на поўнач ад Галбеі ўтварыліся, верагодна, значна пазней, у час славянскай каланізацыі краю ў канцы першага — першай палове другога тысячагоддзя нашай эры. Пра гэта сведчаць назвы, сэнс якіх празрысты і амаль не патрабуе тлумачэнняў. Вайцяхі, Аліхверы, Куніцкія, Рагоўскія — гэта ўсё найменні патранімічныя, названыя па імёнах або прозвішчах людзей, магчыма, першажыхароў.

ВЫТОКІ

Сведкі старажытных часоў

Упершыню чалавек пасяліўся ў тутэйшай мясцовасці на гарадзішчы вескі Голбія. Гарадзішча размешчана на гары Гарадзец, за 0,5 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Галбяіца. Выяўлена ў канцы XIX ст. Пакроўскім Ф.В. Абследавана ў 1938 г. А. і У. Галубовічамі, у 1972 г. — Звяругам Я.Т., у 1990 г. — Квяткоўскай А.В. Гэтымі даследчыкамі былі закладзены шурфы, гэта значыць, невялікія раскопы. У 1998 г. археалагічны раскоп на плошчы 32 м^2 (8 м х 4 м) правеў археолаг Эдвард Зайкоўскі.

Пляцоўка гарадзішча мае круглую форму дыяметрам 45 м. Па ўсяму перыметру акружана валам шырыней да 9 м і вышынёй да 2,5 м. З захаду, поўначы і ўсходу ёсць другі вал даўжыней каля 200 м, шырынёй 5-6 м і вышынёй 1,0-1,5 м на адлегласці ад першага на 8–10 м. За другім валам захаваліся сляды рова глыбінёй да 0,5 м. Роў мае шырыню 6 м, з захаду і поўначы яго даўжыня каля 110 м, а з поўдня — 18 м. З трох бакоў гарадзішча акружала вада.

Археалагічныя даследаванні гарадзішча ў 1990 г. праводзіліся на раскопе памерамі 6х6 м^2. Тады выявілі пад дзірваном пласт чорнага колеру з вялікай колькасцю вуглёў і абпаленых расколатых камянёў. У гэтым перапаленым пласце былі знойдзены фрагменты керамічнага посуду, зярняты фасолі. На глыбіні 0,8 м выйшлі на праслойку зямлі з буйнымі (да 0,2 м) вуглямі, ніжэй — зноў чорная зямля. На глыбіні 1,9 м пачаўся слой пяску з уключэннем гліны — мацярынская парода. Знаходкі: фрагменты венчыкаў непаліўных гаршкоў з лінейным и рыфленым арнаментам, фрагмент днішча, зярняты фасолі. Усе знаходкі датуюцца XI–XII ст.ст.

www.kamunikat.org

А.В.Квяткоўская зрабіла выснову, што, зыходзячы з характару культурнага слоя і знаходак, можна меркаваць, што жыццё на гарадзішчы працягвалася нядоўга. Узнікшы ў самым пачатку XI ст., паселішча праіснавала да XII ст. і знікла ў выніку пажару. Пасля гэтага гарадзішча не адбудоўвалася.

Э.М.Зайкоўскі не зусім пагадзіўся з такой высновай. У час яго раскопу на плошчы 32 м^2 амаль не было знойдзена вуглёў, толькі ў самым цэнтры гарадзішча, дзе было месца для вогнішча. Зайкоўскі лічыць, што гарадзішча вёскі Галбея магло быць крэпасцю палачан на мяжы з балтамі, альбо паганскім капішчам, паколькі сярод мясцовых жыхароў існуе легенда, што на гары Гарадзец стаяла царква, якая з-за грахоў людзей праваліласся пад зямлю.

Галбейскае гарадзішча — гара «Гарадзец»

Вось як апісвае Галбейскае гарадзішча Э. М. Зайкоўскі (цытуецца па навуковай справаздачы): «Гарадзішча «Гарадзец» разьмешчана на паўночна-заходнім беразе воз. Галбейскае, прыблізна за 0,05 км на паўночны ўсход ад вытоку р. Галбяіцы з возера (правы бераг) і за 0,4 км на ўсход ад в. Галбея і на такой жа адлегласці на поўдзень ад левабярэжнай часткі вёскі.

Вышыня гарадзішча — каля 5–7 м. Пляцоўка круглая, увагнутая ў цэнтры, яе дыяметр каля 58 м. Краі пляцоўкі вышэй цэнтра на 1,5 м. Але гэта не вал, таму што пляцоўка ад краёў і амаль да цэнтра паніжаецца надта плаўна ў параўнаньні з больш крутымі вонкавымі сьхіламі. Краі пляцоўкі гарызантальныя на шырыню каля 8 м, а потым паступова паніжаюцца да цэнтра. У цэнтры зусім гарызантальная пляцоўка мае дыяметр каля 10 м.

Вывучаліся агаленні на пляцоўцы. На самым паўднёвым краі пляцоўкі зьверху да гл. 0,18 м залягае клейкі суглінак, пад ім — цёмна-шэрая да чорнага супесь таўшчынёй 0,12 м, ніжэй — мацерыковая гліна. У самым цэнтры пляцоўкі і за 16–18 м ад яе паўночнага і паўднёвага краёў культурны пласт (цёмна-шэрая да чорнага супесь) мае магутнасць 0,4–0,5 м, а магчыма і больш. Мацярык складаецца там з жоўтага пяску. Знойдзены фрагмент ганчарнай керамікі з рыфленай вонкавай паверхняй, другі фрагмент быў з прачэрчаным арнаментам.

Жыхарка в. Голбія — Бурак Валянціна Вікенцьеўна, 1938 г. н. — распавядала легенду, што на Гарадцы раней стаяла царква, якая потым праваліласся пад зямлю.



Кераміка і кафля з гарадзішча ў Галбеі
(з экспазіцыі музея Гуцкай школы)

www.kamunikat.org

Зараз на Гарадцы стаіць ахоўны знак.<…>Цалкам верагодна, што Гарадзец з'яўляўся гарадзішчам-сьвяцілішчам».

Прыкладна за 0,5 км на поўнач ад Голбіі ва ўрочышчы «Валатоўкі» знаходзіцца курганны могільнік у складзе 55 курганоў, з іх 35 вышыней 1,5–2 м. Памеры могільніка: 150 м з усходу на захад, 90 м з поўначы на поўдзень. Даследчык з Варапаева Зямчонак І.П. знайшоў дакументальны матэрыял, які сведчыць, што бронзавая шыйная грыўна з гэтага могільніка знаходзіцца ў Кракаўскім музеі ў Польшчы. У час Вялікай Айчыннай вайны жыхары в. Голбія ў курганах хавалі свой скарб.

Прыкладна за 1 км на поўдзень ад гарадзішча, каля вёскі Манеўшчына, знаходзіцца другі курганны могільнік у складзе 196 курганоў, з якіх 125 маюць сярэднія памеры, 71 — малыя. Курганоў, якія б мелі памеры, як ва ўрочышчы «Валатоўкі», на гэтым некропалі няма. Памеры могільніка даволі вялікія: 70 х 230 метраў.

Найбольш старажытныя рэчы, якія выяўлены ў нашай мясцовасці, — гэта наканечнікі дзіды і стрэлы. Іх знайшлі вучні Гуцкай сярэдняй школы. Зараз гэтыя рэчы захоўваюцца ў школьным музеі. Таксама вучнямі ў «Двары» каля маста знойдзены фрагменты зялёнапаліўной кафлі і кавалкі кафлі з выявамі бягучага грэка і галавой індзейца. Падобная зялёнапаліўная кераміка ў Пастаўскім музеі датуецца XVII–XVIII ст.ст. Яшчэ ў Двары знойдзены металічныя абцасы для вайсковага абутку. Падоб-ныя абцасы ў Браслаўскім краязнаўчым музеі датуюцца таксама XVII–XVIII ст.ст.



Жалезныя рэчы з гарадзішча ў Галбеі (з экспазіцыі музея Гуцкай школы)

Упершыню вёска Голбія згадваецца пад 1603 г. на карце «Вялікае княства Літоўскае», якая была падрыхтавана да выдання Т. Макоўскім пад кіраўніцтвам і на сродкі князя Мікалая Радзівіла «Сіроткі». На ёй паселішча пад назвай «Олбія» пазначана паміж Полавам і Асінагарадком.

Валатоўкі

У другой палове XIX стагоддзя ў весцы Голбія існаваў млын, які знаходзіўся на віры каля маста праз раку Галбяіца. Некаторыя сталыя людзі сведчаць, што млын існаваў «пры Мікалаю» (верагодна, пры Мікалаі II) (у прыватнасці, пра гэта паведамляе Мядзюха Фёдар*), іншыя спасылаюцца на Тумаша (старэйшага жыхара вёскі Голбія, які перад Вялікай Айчыннай вайной меў больш за 90 гадоў), што ён не памятаў млына. Пра тое, што млын існаваў, сведчыць ланцужок паляў, якія можна было бачыць у рацэ яшчэ ў 2005 годзе. Аб іх разбіваліся крыгі лёду ў час крыгаходу. Рэшткі млына былі ўскрыты экскаватарам пры пабудове сучаснага маста праз раку Галбяіца. Таксама паблізу млына існавала кузня. Пра гэта сведчыць

www.kamunikat.org

тое, што мясцовыя жыхары называюць невялікі пагурак каля маста «кузенка».

Неаднаразова старэйшыя жыхары вёскі ўспамінаюць пра тое, што на гарадзішчы вёскі Голбія існавала драўляная царква, якая потым згарэла. Ускосным доказам гэтаму можа быць той факт, што пры наважванні скаціны на гарадзішчы, заганяючы прэнт у зямлю, часцяком натыкаюцца на каменне і цэглу, якія, магчыма, з'яўляюцца рэшткамі падмурка. Аднак дакументальных звестак існавання царквы ў вёсцы Голбія пакуль што не знойдзена.

Галбейскае таварыства

Па першаму перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года ў Голбіі існаваў фальварак. Паводле атрыманых звестак, у ім пражывала 34 чалавекі (17 мужчын і 17 жанчын), у вёсцы Голбія — 111 чалавек (70 мужчын і 41 жанчына). Дваровых месц, занятых пабудовамі, было: у фальварку — 4, у вёсцы — 21.

Вёскі Пастаўскай воласці аб'ядноўваліся ў таварыствы. У склад Галбейскага таварыства ўваходзілі наступныя паселішчы: Аліхверы (6), Барэйкі (40), Бернатаўшчызна (1), Вайцяхі (9), Войшнева

Голбія (Олбій) на карце Мікалая Радзівіла 1603 (1613 г.)

(зараз Ольшнева) (3), Галбея (7), Куніцкія (6), Рагачоўскія (3), Трумбічы (3). У таварыстве налічвалася 990 чалавек. З іх 984 беларусы і 6 яўрэяў. Адзін з васьмі фельчараў Пастаўскай воласці практыкаваў у вёсцы Куніцкія Галбейскага таварыства. Са 118 гаспадарак Галбейскага таварыства 17 не мелі коней, 6 — кароў. Восем сем'яў не мела ўласнай зямлі. Па ўсей воласці на 1 карову ў сярэднім прыпадала 3,8 чалавекі, на аднаго каня — 6 чалавек. У сем'ях у сярэднім налічвалася 6–7 чалавек.

У Галбейскім таварыстве мелася 196 галоў рагатай жывёлы, 152 свінні, 118 коней, 234 авечкі, 25 вулляў, 239 фруктовых дрэў, 3 саломарэзкі, 4 малатарні.

На землях уладальніцкіх Галбея і Хардакова было 130 галоў рагатай жывёлы, 8 свіней, 15 коней, 115 фруктовых дрэў, 1 саломарэзка, 1 малатарня. Авечак і вулляў не трымалі.

Гадавая цана рабочых рук у сярэднім па воласці складала: сямейныя — 36 рублёў і ардынарый (карова, агарод, бульба); халастыя, калі на ўсім гаспадарскім, то 30 рублёў, калі на сваім, то 45. Жанчыны на ўсім гаспадарскім (адзенне, абутак) — 15 рублёў, на сваім — 25. Узімку месячны заробак мужчын быў 5 рублёў, жанчын — 2 рублі; летам — 8 руб. і 3 руб. 50 кап. адпаведна. Падзённа мужчыны ў залежнасці ад работы атрымлівалі ад 20 да 60, а жанчыны — ад 15 да 45 капеек.

Назва работ	Мужчыны (капеек у дзень)	Жанчыны (капеек у дзень)
Пасадка бульбы	30	20
Уборка бульбы	25	15
Сенакос	55	30
Жніво азімых	45	45
Жніво яравых	40	25
Малацьба	20	15

З адыходных промыслаў у сярэднім прыносілі 30 рублёў. Ездзілі ў Пецярбург, Екацярынаслаўль, Адэсу, Ялту і іншыя гарады.

Штогадовыя расходы сярэдняга гаспадара былі наступныя (у рублях): подаці — 10, страхаванне — 2, мірскія — 2, царкоўныя —

www.kamunikat.org

Голбія на карце 1800 года

1, рамень — 7, жалезныя вырабы — 2, дровы — 6, пакупка адзення, бялізны — 4, на майстроў — 2, хатні посуд — 2, агульнаканцэлярскія подаці вучылішча — 1, запалкі — 40 кап, шлык* — 1 руб 20 кап, соль — 80 кап. Усяго — 45 рублёў 40 капеек.

Тут не прынята на ўвагу, што нават самыя бедныя куплялі мяса да Каляд і Вялікадня па 10 фунтаў, што каштавала 1 руб 50 кап, і да куцці рыбы па 50 кап. Атрымлівалася, што гаспадар павінен быў расходваць каля 45-50 рублёў у год. А такія грошы яшчэ трэба было зарабіць. У 1900 годзе даходу ад зямлі не атрымалі з прычыны засухі, але і ў лепшыя гады ён не перавышаў 30 рублёў. Выйсце з такога становішча было ў зімовым возніцтве, часткова ў тым, што адзін, часам два чалавекі наймаліся на работу ў маёнтак або ў горад на фабрыку ці завод, ішлі на запашку да арандатараў і ўласнікаў, дзе працавалі летам усей сям'ёй за частку ўраджаю. Там жа зімавала і скаціна наймітаў.

У 1901 годзе насельніцтва апынулася ў асабліва цяжкім становішчы з прычыны паўторнай засухі. Каб не дапамога мірскіх крамаў, то насельніцтва не ўратавалася б ад голаду.

Колькасць рамеснікаў па Галбейскаму таварыству была наступная: бондараў — 4, пільшчыкаў — 6, кавалёў — 5, сталяроў — 4, шаўцоў — 6, краўцоў — 1.

Пасля 1902 года фальваркамі Варапаева і Галбея стаў валодаць Канстанцін Пшаздзецкі.

Голбія пры Польшчы мела статус мястэчка. Тады ж у вёсцы ладзіліся значныя кірмашы і базары. У Двары, дзе зараз зна-

Канстанцін Пшаздзецкі (справа)



Гасподскі двор Голбія на карце канца XIX стагоддзя

www.kamunikat.org

ходзяцца катэджы, напэўна, яшчэ да прыходу палякаў існавала цагельня, бо старыя людзі прыгадваюць, што там былі невялікія ямы і шмат бітай цэглы. Гінько Антону Канстанцінавічу ў час яго маладосці старыя людзі расказвалі, што яшчэ ў часы прыгону пан хацеў раздзяліць Гуцкое возера на дзве часткі дарогай. Яна павінна была праходзіць там, дзе зараз знаходзіцца каса, а каб вада вольна працякала, касу з другім берагам возера планавалася злучыць мастом.

Па словах Мішуты Міленція Ягоравіча, яго дзед Антось нейкі час працаваў у Голбіі ў цэхгаўзе (напэўна, цэхгаўз — грамадскі склад з рэзервам на выпадак неўраджаю), лічыў зерне. А паколькі быў неадукаваным, то ставіў нейкія зарубкі на палках. Аднойчы галбейцы яго добра пачаставалі і самі даставілі зарубак. Больш ён не працаваў. Антось Мішута працаваў у цэхгаўзе, напэўна, пры Мікалаю Першым, бо памёр у 1934 годзе ў даволі сталым узросце.

Ліхалецце першай сусветнай

У час першай сусветнай вайны беларусы ў асноўным ваявалі на Паўднёвым фронце (на Украіне) з аўстрыйцамі. Туды ж, на паўднёвы фронт, трапіў бацька Балта Фёдара Фёдаравіча. Ён расказваў, што ў нядзелю і ў час абеду аўстрыйцы не ваявалі. Бацька Балта Ф.Ф. трапіў пад прымяненне атрутнага газу. З іх батальёна засталося 8 чалавек. Толькі падпаліўшы траву, яны выратаваліся, бо дым прымусіў атрутны газ падняцца вышэй. Аднак і гэтых 8 чалавек трэба было лячыць. Іх адправілі на Маскву, але даехаў толькі бацька Балта Ф.Ф., астатнія памерлі па дарозе. У нашай мясцовасці таксама праходзіла лінія фронту паміж рускімі і немцамі. Акопы цягнуцца з поўначы на поўдзень у 2–3 мілі, бачна таксама і байніцы. Найлепш акопы захаваліся на лініі ад Голбіі да Васілеўшчыны. На адрэзку ад Голбіі да маста праз Галбяіцу бачна каля 30 ям для зямлянак і 2 кругавыя акопы для кулямётаў. На адлегласці каля 200 м ад галбейскіх могілкаў па дарозе на Куніцкія з правага боку ў канаве добра бачны жэрдкі, якімі ўмацоўвалі траншэі, каб тыя не асыпаліся. Насупраць вёскі Аліхверы рака была перагароджана калючым дротам. Акопы капаліся палоннымі аўстрыйцамі пад кіраўніцтвам рускіх афіцэраў з мэтай прыпыніць прарыў немцаў з раёна Свянцянаў у жніўні 1915 г. Імі ж былі выкапаны таксама студні на Гуце і сховішча для коней каля Манеўшчыны. Адна студня і зараз існуе на панадворку Балта ў пачатку вуліцы Садовай. Па ўспамінах жыхароў Манеўшчыны, узброеных сутычак у ваколіцах вёскі не было. Рускія адступілі ў напрамку на вёску Белькі. Па ўспамінах жыхароў вёскі Голбія, мост праз раку Галбяіцу шмат разоў пераходзіў з рук у рукі.

У часы першай сусветнай вайны на Галбейшчыне распаўсюдзілася эпідэмія брушнога тыфу. У сям'і Хацько, якая ў той час жыла на Гуце (потым выехалі ў Рагоўскія), 7 братоў памерла, застаўся адзін Мікалай. Бурак Антаніна Фёдараўна выжыла, па яе меркаванні, таму, што дайшла да каморы, дзе наелася журавін. Але памерлі яе дзеці і шмат дзяцей у вёсцы. Напэўна, ад эпідэміі загінулі палонныя аўстрыйцы, якіх пахавалі неглыбока на полі каля вескі Куніцкія. Ноччу прыходзілі ваўкі і раскопвалі пахаванне. Потым вясковыя жыхары знаходзілі вялікія косці.

Акопы першай сусветнай вайны

www.kamunikat.org

Ю. Свілёнак з в. Паўлюгі, 1914 г.

Верагодна, аўстрыйцы былі з элітных вайсковых падраздзяленняў. Пра высакарослых салдат паведамляла Бараноўскаму Эдуарду Эдуардавічу (1931 г. н.) яго цешча. Яна распавядала, што аўстрыйскія часці размяшчаліся каля вёскі Куніцкія, а немцы — каля вёскі Аліхверы. Ваенныя дзеянні праходзілі ў вёсках Гута, Голбія, Куніцкія, таксама на лясной дарозе, што звязвае Варапаева з вёскай Балаі (так званай «капанцы»). Па словах гэтай жанчыны, ваенныя сутычкі адбываліся толькі ў буднія дні, а ў нядзелю не ваявалі. Пахаванне чэха (чэхі ваявалі на баку Аўстра-Венгрыі) знаходзіцца каля вёскі Вольшнева. Жанчына з вёскі, ідучы на пасту, знайшла забітага чэха і аплакала як свайго. Хто валодаў зямлёй каля магілы, той яе і даглядаў. Потым даглядалі школьнікі, зараз некалькі год ніхто не даглядае. Пахаванне чэха таксама ёсць яшчэ дзесьці на «капанцы». З'яўленне немцаў у нашай мясцовасці ў 1915 г. было кароткачасовым. Тады ж на тэрыторыі шклозавода «Гута» германцамі быў размешчаны шпіталь.

Ужо ў пачатку кастрычніка яны былі адкінуты на захад, і лінія фронту стабілізавалася па мяжы Друя-Паставы-Пінск. Другі раз немцы ў першай вайне прыйшлі ў лютым 1918 г. і знаходзіліся да лістапада 1918 г.



Схема 1-ай лініі акопаў першай сусветнай вайны ад р. Чортка на поўдзень на працягу 1 км (склаў М. Арэх)
(1, 2, 4, 13, 18 — насыпы-озгоркі для пабудовы зямлянак
** — кругавы акоп (магчыма, для кулямёта)*
200 м — адлегласць паміж элементамі лініі абароны)

ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ

Завод, дзе варылі шкло

З 1921 па 1939 гады Заход-няя Беларусь, у тым ліку і Галбей-шчына, уваходзіла ў склад Польшчы. Асноўным прад-прыемствам ту-тэйшага краю быў шклозавод на Гу-це, які вырабляў аконнае шкло. У 1920-я г.г. рабілі шкляные халявы (бутлі), якія потым раскатвалі на аконныя лісты. Завод належаў графу Пшаздзецкаму, які здаваў яго ў арэнду.

Першым арандатарам быў яўрэй Каган, які ў 1905 годзе купіў участак лесу, дзе потым і ўзнікла гэта прадпрыемства. Пра шклозавод «Гута» вядома, што ў час першай сусветнай вайны ён нейкі час выпускаў салдацкія шкляныя флягі. Каган потым пераехаў у Сандамір, дзе таксама арандаваў шклозавод і атрымліваў прыбытак у 1000 злотых за суткі. Сандамірскі шклозавод быў большы, чым Гуцкі, меў шэсць машын «Фурко», але, напэўна, і на тутэйшым шклозаводзе Каган атрымліваў прыбытак у некалькі сот злотых за суткі. Завод працаваў да 1928 года, потым спыніўся з прычыны сусветнага эканамічнага крызісу. У 1936 годзе яго пачалі рыхтаваць да запуску, а ў 1937 ён пачаў працаваць. Пасля Кагана прадпрыемства арандаваў яўрэй Зінгер, а пазней — яўрэй Польвад. Яны дабудавалі завод. Зінгер закупіў у бельгійцаў 4 машыны «Фурко», якія адразу давалі шкляныя лісты памерам 1,7м х 1,3м. Іх адламвалі рукамі пасля

www.kamunikat.org

таго, як па шкле праходзіў шкларэз. Бывалі выпадкі, калі людзі калечылі рукі. Іх лячылі бясплатна. Потым былі прыстасаваны засцярогі для рук. Акрамя аконнага шкла на Гуце выраблялі шкло каляровае, чарнільніцы, гарчычніцы. На заводзе працавалі бельгійцы, каля 10 чалавек: інжынер, 4 майстры (2 з іх рабілі брусы), старэйшы майстар і іншыя спецыялісты.

Старэйшы майстар у выпадку якой-небудзь паломкі, па словах сведкаў, працаваў ад душы. Бельгійцы атрымлівалі вялікую зарплату. На асноўную работу бралі мясцовых жыхароў з 18 гадоў. Усяго на шкло-заводзе ў 1937 годзе налічвалася 540 рабочых (разам з рыбалавецкай арцеллю і з тымі, хто нарыхтоўваў драўніну).

Вырабы шклозавода «Гута»

Першапачаткова шклозавод працаваў, выкарыстоўваючы ў якасці паліва дровы. Іх на шклозавод падвозілі 2 паравозы-«кукушкі», якія хадзілі па чыгунцы, так званай «капанцы», ад Варапаева да Полава з адгалінаваннем на Гуту. «Капанка» мела аснову з добра ўтрамбаванага пласту гліны. Да капанкі дровы падвозілі на конях, якіх мелася каля 10. Яшчэ на заводзе трымалі коней для выезду начальства. Напрыканцы 1936 г., у 1937 г. і ў 1938 г. завод працаваў на вуглі. На прадпрыемстве меліся наступныя цэхі: механічны, малы па плошчы; гарачы, дзе выраблялі шкло; эканамічны, дзе выраблялі брусы; цэх, дзе пры дапамозе коней размолвалі старыя брусы да стану мукі; састаўны, дзе выраблялі шыхту; сушыльны. Лабараторыі не было. Бельгіец правяраў якасць пяску такім чынам: браў яго ў руку, трымаў моцна, а пясок павінен быў высыпацца. Пясок белага колеру прывозілі з Рос, што каля Маладзечна. Кожны працоўны на заводзе меў пропуск, дзе стаяў нумар і назва цэха. Зарплата на заводзе была даволі значная. Давалі водпускі, аднак пенсіі не было. Болт Федар Федаравіч

Жэтоны-пропускі на шклозавод

(1921 г. н.) у 1938 г. атрымліваў каля 170-180 злотых у месяц. Ён працаваў майстрам другой рукі, адказваў за тое, каб шкло было без каменьчыкаў. Той, хто падвозіў дровы, атрымліваў менш. Плацілі 2 разы ў месяц. За 180 злотых можна было купіць 2–3 каровы. Конь каштаваў 200 злотых, ровар — 140 злотых, добры гарнітур — 120 злотых, кабан — 40, авечка — 20, кашуля добрая шаўковая — 5–6 злотых, 1 кг рыбы — 80 грошай, бутэлька гарэлкі — 90 грошай, літр гарэлкі — 3 злотыя 70 грошай. Рабочае адзенне каштавала 2-3 злотыя, але яго выдавалі дарма. Цукар меў кошт 60-70 грошай і быў трох відаў; сіняватага колеру цукар каштаваў даражэй. Сала тоўстае прадавалася па 1,5–2 злотыя. Наведванне доктара каштавала 4 злотыя, укол — 1 злоты, дзень зна-ходжання ў бальніцы — 2,5, аперацыя — не менш за 15. Болт Ф.Ф., які працаваў і на шклозаводзе ў Сандаміры ў Польшчы, за кватэру разам з харчаваннем плаціў 35 злотых у месяц.

У 1933 годзе была закончана пабудова чыгуначнай веткі Варапаева-Друя даўжынёй 80 км, якую праклалі за 3 гады без тэхнікі. Дзіўны выпадак распавядаў Мішуту Міленцію Ягоравічу яго бацька. За некалькі кіламетраў ад чыгуначнага маста праз раку Шурыца сяляне зрабілі насып, а калі раніцай вярнуліся на працу, то яго ўжо не было — засмактала твань. Зноў насыпалі, і зноў усё паўтарылася. Толькі насыпаўшы зямлю ў мяшкі, можна было прайсці гэты складаны ўчастак будоўлі.

У гэтым жа 1933 годзе ўладанні К. Пшаздзецкага наведаў Прэзідэнт Польшчы Ігнацы Масціцкі на картэжы з дзесятка аўтамабіляў. Ён прысутнічаў на адкрыцці вышэйзгаданай чыгуначнай веткі Варапаева-Друя. Тады ж урачыста быў пушчаны першы цягнік.

Прэзідэнт, былы прафесар хімічных тэхналогій, з цікавасцю наведаў шклозавод Гута. Каля прадпрыемства да яго прыезду зрабілі

www.kamunikat.org

Чыгунка каля Гуты

браму з каляровага шкла. У Гуце ў той час ад-быўся такі выпадак: прэзідэнцскі аўта-мабіль выпадкова зачапіў электрычны слуп, і на заводзе недарэчы знікла святло. Па ўспамінах Красоўскага Аркадзя, у вёсцы Алашкаўшчына ў той час шмат было размоў пра Масціцкага, асабліва пра яго вусы, закручаныя ўверх. Жыхары вёскі, якім давялося пабачыць прэзідэнта Польшчы на Гуце, падзяліліся ўражаннямі з аднавяскоўцамі.

У часы падпарадкавання Заходняй Беларусі Польшчы 2 гады выдаліся вельмі мокрымі, і насельніцтва не здолела вырасціць ураджай. Тады дапамаглі палякі. Яны прывезлі некалькі вагонаў бульбы, круп, збожжа. За гэтымі харчовымі прадуктамі трэба было ехаць у Варапаеўскую гміну.

Уладанні графа Пшаздзецкага

На тэрыторыі Гуты ў польскі час было каля 30 хат, або, як называлі, баракаў. Належалі яны, як і завод, графу Пшаздзецкаму. У такім бараку жыло некалькі сямей. За кватэру трэба было плаціць 5 злотых і тады, калі працаваў завод, і тады, калі прастойваў. Каля баракаў меліся надзелы зямлі, і кожная сям'я мела сотак 5–6, зрэдку больш. Садоў на Гуце не было, бо і зямля лічылася графскай. На заводзе стаяў дызель і шухаўскі кацёл, якія давалі электрычнасць. Шухаўскі кацёл працаваў на вуглі, трэсках, карчах і іншых адыходах драўніны. Толькі пры ціску пары ў 60 атмасфер ён мог выпрацоўваць электрычнасць. Глядзеў за катлом качагар Філіп, які меў з папярэдняй вайны такую дзірку ў целе, што было бачна, як працуюць лёгкія. Электрычнасць на Гуце была толькі тады, калі працаваў завод. Лазня адсутнічала, і памыцца людзі маглі толькі ў цёплы час у вадаёме з драўлянай падлогай, які быў выкапаны ніжэй сучаснага механічнага цэха. Дзесьці ў 1939 г. на заводзе з'явіўся грузавы аўтамабіль — «палутарка». Працаваць на завод прыходзілі з Галбеі, Аліхвераў, Вайцяхоў, Бараўкоў (Бараўкі зараз сталі часткай г.п. Варапаева).

Гуцкое і Галбейскае азёры таксама, як і завод, арандавалі Зінгер і Польвад. Была ў тутэйшай мясцовасці і свая рыбалоўная арцель, колькасцю каля 15 чалавек. Зімой рыбу лавілі невадам, прабіўшы ў лёдзе дзве вялікія палонкі памерам 2 х 3 м.

Месца, якое называецца Двор, а таксама ўзгорак, дзе зараз знаходзіцца Гуцкая сярэдняя школа, землі з заходняга боку возера да дарогі Варапаева — Белькі, землі каля Куніцкіх і Рагоўскіх лічыліся ўласнасцю графа Пшаздзецкага. Частка насельніцтва Гуты жыла з таго, што працавала на панскай зямлі. Гэта так званыя «запашнікі». У Двары для іх стаяла хата, дзе жылі сем'і Рубель (тры мужчыны, тры жанчыны, дзеці), Данішэўскіх (два браты-халасцякі), Гінько. Данішэўскія, Сцепка і Захарка, засталіся пасля І сусветнай вайны. Паколькі яны не былі жанатыя, наймалі жанчыну для гатавання ежы, мыцця адзення, што, магчыма, і паслужыла прычынай іх вывазу бальшавіцкай уладай у 1939 г. Па ўспамінах Гінько Анто-

www.kamunikat.org

на Канстанцінавіча (1921 г. н.), разам з бацькам і яшчэ двума мужчынамі яны ўзворвалі і абкошвалі 150 га зямлі. Ураджай збожжавых дзялілі так: палову браў пан Пшаздзецкі, палову — запашнікі. У час дзяльбы нельга было стукнуць па цабэрку (цабэрак — драўляная бочка ў 3 пуды), бо тады шуфель зерня, а гэта 5 кг, лічыўся панскім. Сяўбу павінны былі мець запашнікі, аднак увосень пан яе вяртаў. Граф сачыў, каб у глебу ў дастатковай колькасці ўносілі арганічныя ўгнаенні, і таму ўраджай звычайна быў добры. Жыта ў Двары расло вялікае. Там, дзе зараз стаяць катэджы, сеялі толькі віку і гарох. У Двары знаходзіліся дзве аборы, прычым адна — цалкам каменная, толькі зверху дакладзеная цэглай, памерам 50 х 20 метраў. У адной аборы стаялі графскія авечкі і авечкі запашнікаў, у другой — выязны конь, рабочыя коні, а таксама каровы. Пасля другой сусветнай вайны абору разабралі, скарыстаўшы яе для будаўніцтва завода.

У ваколіцах Голбіі граф звычайна паляваў на ваўкоў. Больш таго, ён іх і падкармліваў, купляючы ў сялян старых і слабых коней. А паколькі паляванні ладзіліся не часта, некалькі разоў на год, драпежнікі смялелі, не баяліся людзей, цягалі авечак, рвалі коней, падыходзячы да іх нават днём. Па ўспамінах Гінько Антона Канстанцінавіча, ваўкі стаялі, клацаючы зубамі, не спяшаючыся ўцякаць. Людзі зімой баяліся заходзіць у лес, а стрэльбы набываць не мелі права. На паляваннях можна было крыху зарабіць грошай: граф плаціў 2 злотыя тым, хто крыкам заганяў ваўкоў, выкарыстоўваючы пры гэтым спецыяльныя жалезныя хлопкі. Паляваў ён і на качак, даючы тым, хто падымаў іх крыкам у паветра, адзін злоты. Граф меў прыстань на Гуцкім возеры для маторнай і парусной лодак.

Сядзіба графа Канстанціна Пшаздзецкага ў Варапаеве

Яна знаходзілася каля сучасных катэджаў і мела шырыню 2 м, даўжыню 10–15 м. Лодкі былі вялікія, 6 на 2 метры, і ўмяшчалі каля 10 чалавек. Са слоў таго ж Балая Уладзіміра Емяльянавіча, жыхары вёскі Манеўшчына дапамагалі перацягваць лодку праз мелі на шляху з Варапаева на Гуту. Насупраць сучаснай пілярамы знаходзіўся масток, які вёў метраў на 100 ў глыб возера. Шырыню ён меў 1,5 метра і над вадой узвышаўся на 1,5 метра. Каля мастка знаходзіўся гараж, дзе стаяла маторная лодка, і склад, дзе захоўвалася графскае піва. Потым, з прыходам бальшавіцкай улады, лодку і склад разабралі. Дарэчы, цэгла, з якой быў пабудаваны склад, была вельмі трывалая, мела кляймо, і зараз яе можна знайсці ў лепшым выглядзе. Ахоўваў гараж і склад стары аб'ездчык Абразоўскі, які жыў непадалёку. Калі граф задумваў пакатацца на лодцы, то за тыдзень да свайго прыезду загадваў леснікам прачышчаць раку. Сустракалі графа леснікі ў форме, стаўшы ў шарэнгу. Граф Пшаздзецкі быў кавалерыйскім палкоўнікам і любіў на кані аб'язджаць свае лясы, якіх ён меў каля 5 тыс.га, уключаючы тэрыторыю ад Мосара, Мішут і да Пастаў. Перад вайной граф пачаў прадаваць лес невялікімі надзеламі, таксама як і зямлю. Часам ён прыязджаў на шасцёрцы чорных коней, якой кіраваў возчык. Возчык меў пугу даўжынёй 6 метраў і, па ўспамінах Гінько А.К., даволі прыгожа мог ёй махаць. Быў граф некаторы час жанаты, але потым разышоўся з жонкай і застаўся жыць з дачкой. Па словах Балая У.Е., дачка была непрыгожая з твару, мела «нос як кол». А перад вайной граф купіў легкавы аўтамабіль, на якім незадоўга да прыходу бальшавікоў ноччу збег у Вільню, а потым выехаў у Амерыку.

Надлесны і леснікі

Там, дзе зараз знаходзіцца школьны агарод, размяшчаўся дом графскага надлеснага Савіцкага. Да яго вяла алея хуткарастучых канадскіх таполяў, пасаджаных у 1936 годзе. Часткова алея захавалася і зараз. Дом надлеснага быў драўляны, двухпавярховы; уваход размяшчаўся з боку возера. Мелася некалькі пакояў: кухня, дзве

www.kamunikat.org

спальні (надлеснага і яго бацькі), рабочы кабінет, дзе надлесны выплочваў грошы леснікам, сталовая, дзіцячы пакой і пакой, дзе спала кухарка. Надлесны быў чалавек тоўсты, сярэдняга росту; меў жонку і дачку. Яму падпарадкоўвалася 50 леснікоў. На працягу 1935 года ў Савіцкага працавала кухарка Лукашэвіч Станіслава Канстанцінаўна (1919 г. н.). Паблізу хаты каля возера знаходзіліся дзве молі, або басейны, памерам 6 х 6 м і 5 х 4 м. Молі былі абшыты дошкамі, меліся кладкі, з якіх ныралі. Па словах Павініч Веры Уладзіміраўны (1933 г.н.), мелася адна купальня пад дахам белага колеру і з прадаўгаватымі вокнамі. З усходняга боку ад хаты надлеснага знаходзіўся сад, абгароджаны двухметровым калючым дротам. У садзе было каля 200 дрэў: яблынь, ігруш, сліў, вішань і іншых. Каля саду знаходзілася хата, у якой жыў вартаўнік Садоўскі і два леснікі. За спробу пакаштаваць без дазволу садавіны можна было пазбавіцца работы. Вясной у засені дрэў ставілі вялікі стол, які восенню разбіраўся. На беразе ракі Галбяіца пры ўпадзенні яе ў Галбейскае возера стаяла лядоўка надлеснага. Лядоўка была зроблена такім чынам, што нават летам у ёй захоўваўся лёд. Побач з месцам, дзе яна стаяла, вучні Гуцкай сярэдняй школы знайшлі рэшткі 80 збаноў, гарлачыкаў. У госці да надлеснага прыязджалі ксяндзы з Паставаў і з Вільні.

Рэшткі алеі канадскіх таполяў

Наведваўся да надлеснага і граф Пшаздзецкі. З сабой ён часта прывозіў гасцей: англічан, французаў, палякаў. Жыхар вёскі Манеўшчына Балай Уладзімір Емяльянавіч (1929 г. н.), ідучы ў польскую школу ў Гуту, часта сустракаў яго або верхам на кані, або на лыжах, калі той ехаў, трымаючыся за вяроўку, прывязаную да саней.

Нядрэнна жылі леснікі (па словах старажылаў, калі не мелі занадта вялікую сям'ю). У графа іх было каля 200. Леснікам выдавалі наган, які страляў алавянымі кулямі, спіралепадобную трубку, у якую трубілі, склікаючы ўсіх леснікоў, калі ў лесе адбываўся які крадзёж або (здаралася і такое) іх хацелі пабіць. Леснікам выдавалі форму; асабліва ў вочы кідалася шапка — чатырохкутка з медным аколкам. Яны атрымлівалі зарплату, але мелі і зямлю, па 5–6 га. Аднак самі на ёй не працавалі, а наймалі парабкаў. Леснікі не валілі лес, а сачылі за тым, каб ніхто яго не краў, каб ягады збіралі ў тэрмін, а зборшчыкі ягад мелі з сабой картачку, якая выдавалася на сезон. Каб яе атрымаць, чалавек мусіў заплаціць 2 злотыя. Выконвалі леснікі таксама і функцыю рыбнагляду. Рыбу нельга было лавіць сеткамі, але насельніцтва браканьернічала. Вось, напрыклад, якая гісторыя здарылася. За Гуцкім возерам, каля Манеўшчыны, знаходзілася сажалка, каля якой былі пасаджаны дубы і таполі. На гэта месца граф любіў прыводзіць гасцей. Ляснік Шалман, які жыў злева за гуцкім мастом праз раку Галбяіцу і меў там зямлю, напаткаў жыхароў Манеўшчыны: трох хлопцаў,

Людзі з Барэек, 1925 г.

www.kamunikat.org

якія лавілі рыбу. Сетку хлопцы не хацелі аддаваць лесніку, і ён раніў аднаго з іх, дзядзьку Балая Уладзіміра. Раненне было цяжкае, у жывот, і, каб уладзіць гэту справу, Пшаздзецкі зрабіў гэтага чалавека пасля выздараўлення лесніком на Глушыцы. Стаць лесніком было даволі складана, і людзі пагаворвалі, што, каб заваяваць давер графа, трэба было выдаць свайго родзіча, напрыклад, за варэнне самагону. Можа, гэта і не зусім так. Лес у той час высякалі ашчадна. Гінько казаў, што «рэха ў лесе доўга разыходзілася». На дровы давалі толькі верхавіны дрэў. Пасля распрацоўкі надзелу ішлі збіраць гэтыя верхавіны і толькі зімой вывозілі, каб не пашкодзіць падлесак. Адзін год можна было бясплатна браць лес на дровы, які зносілі рукамі без дапамогі сякеры. Потым гэтае правіла адмянілі. Можна было браць на дровы гарэлы лес. Часам леснікі маглі самі падпаліць лес, бо гэты лес ішоў бы на дровы, а вяскоўцы далі б выпіць. Але гэта было рэдка, бо падпальшчыкаў шукалі. Праўда, нікога звычайна не знаходзілі. Балай Уладзімір расказваў, што манеўшчынцы самі падпалілі лес. Падпальвалі крэсівам, бо пакуль разгарыцца, можна спакойна прыйсці дахаты. Пан Пшаздзецкі за тушэнне лесу плаціў, і гэта быў добры заробак. Таму тушыць асабліва не спяшаліся. Адвернуцца леснікі, якія арганізоўвалі тушэнне, а мужчыны галавешку далей у лес укінуць.

Удзельнікі з'езда баптыстаў, в. Кейзікі,1936-37 гг.

Жылі ляснікі ў асноўным у лесе на сваіх надзелах. У Двары разам з вартаўніком пражывалі двое з іх. У пачатку Гуты з боку Варапаева меў сядзібу Маліноўскі, потым Кухальскі. Аб'ездчыкам на Глушыцы быў Кухальскі, якому падпарадкоўвалася некалькі ляснікоў. На Шурыцы працаваў таксама Кухальскі. У цэнтры вёскі, каля магазіна, жыў ляснік Аліхвер. Ён меў 8 дзяцей. На Красным Бары, у лесе, паміж рэчкай Шурыцай і Балаямі, жыў ляснік, які потым быў забіты хлопцам сваёй дачкі, бо тая сказала яму, што ў бацькі ёсць золата. Аднак забойца з Белек не пазбег пакарання, бо пад печкай у час забойства схаваўся наёмны хлопчык — пастушок, які ўсё бачыў. Быў таксама свой ляснік у Вайцяхах і Трумпічах.

З прыходам бальшавіцкай улады леснікоў сагналі на шклозавод, дазволіўшы ўзяць з сабой 8 кг рэчаў, і вывезлі ў Сібір. Адтуль пазней вярнуўся толькі Аліхвер.

Жыццёвыя праблемы

Яшчэ адной крыніцай заробку для вяскоўцаў была валка і вываз лесу. За адзін дзень працы можна было атрымаць 5 злотых. Жанчыны збіралі ягады, але яны каштавалі танна. На 1 злоты трэба было сабраць 3 пуды брусніц.

З зямлёй у вяскоўцаў было складана. Жыхары Гуты яе не мелі, бо працавалі на шклозаводзе. Галбейцы мелі па 1-2 га зямлі, жыхары Вайцяхоў — таксама мала. Красоўскі Аркадзь успамінаў, што ў яго сям'і зямлі не хапала і даводзілася арандаваць яе ў больш багатых аднавяскоўцаў, аддаючы за гэта палову ўраджаю. У жыхароў Трумпічаў было па 5 га зямлі. У гэтай вёсцы Павалковіч меў 10 га зямлі, але яна дзялілася на трох сыноў. На тым месцы, дзе пасвіцца галбейскі статак, зямля належала вяскоўцам з Рагоўскіх і Аліхвераў. Добра жылі жыхары Вольшнева. У польскі час у вёсцы было 12 хат. Каган меў больш за 20 га зямлі, Вінцук — 30 га, Янучкоўскі Сельвестр (або Сельва) — 40 га, 6-7 кароў з цялятамі, 4 кані; Аліх-

www.kamunikat.org

Гута-Голбія на польскай карце

вер Мадэст — 6–8 кароў з цялятамі, 2 кані. Янучкоўскі Вікенцій спачатку меў 12 га зямлі, потым дакупіў яшчэ 12. У сваёй гаспадарцы ён трымаў 4–5 кароў, 40 коней, да 20 авечак (такую колькасць авечак мелі амаль усе). Янучкоўскі Вікенцій плаціў падатак 10 злотых у год. Падаткі сплочвалі ў залежнасці ад якасці зямлі. Вяскоўцы таксама займаліся тым, што вырошчвалі лён для продажу.

Вольшнева планавалася рассяліць на хутары. Янучкоўская Ганна (1926 г.н.) казала, што гэта было б вельмі добра. За падаткі адказваў бы кожны гаспадар сам, а не ўся вёска, і зямля была б у адным месцы, а значыць, яе лягчэй апрацоўваць. Непадалеку ад Вольшнева знаходзіўся хутар Малое Вольшнева. Там купіў зямлю ў 1933 г. Чарняўскі Адам. Зямля мела плошчу амаль 12 га, значная частка яе была балоцістая, і каштавала яна крыху больш за 3500 злотых.

Зямля мела важнае значэнне, таксама, як і ўлада бацькі ў сям'і. Бацька Гінько А.К. ажаніўся без дазволу, за гэта ягоны бацька пазбавіў сына зямлі, якой ён меў шмат каля Полава. Сын прасіў не раз прабачэння, але бацька не дараваў, і давялося хлопцу ехаць батрачыць у Гуту дзесьці ў 1929–1930 г.г.

Людзі імкнуліся рознымі шляхамі знайсці заробак. Так, па вёсках у святы хадзілі беспрацоўныя з горада, спявалі песні. За гэта іх частавалі. Мясцовыя называлі такіх людзей «тры каралі».

На Галбейшчыне пры Польшчы ў розны час існавалі дзве пачатковыя школы, размешчаныя ў звычайных хатах. Адна была ў Голбіі, каля маста праз раку Галбяіца. Вядома, што ў школу прыязджала рухомая кінаўстаноўка для паказу фільмаў. Гэта школа дзесьці ў сярэдзіне 30-х гадоў была закрыта. Другая школа дзейнічала ў вёсцы Гута непадалёку ад завода. У ёй былі 4 класы: у 1–2 займалася каля 20 вучняў, у старэйшых — менш. Прадметы ў школе выкладаў паляк Твардоўскі. Дзеці вучыліся ў дзве змены, у меншых класах было па два ўрокі ў дзень, старэйшыя займаліся даўжэй. За непаслушэнства і нявывучаны ўрок настаўнік ставіў на калені, біў па руках, круціў вушы. Да настаўнікаў звярталіся не інакш як «пан настаўнік» і, калі яму патрэбна было куды-небудзь ехаць, для яго запрагалі каня з бразготкамі. У школе кармілі дарма. Гатаваўся адзін від страў. Паблізу ад школы знаходзіўся «рэстаран». Гэта была звычайная хата, якая мела такую назву. Яе гаспадар у тым будынку не жыў. Пад рэстаран быў адведзены адзін пакой, у якім стаялі 3–4 сталы. Наведвальнікі маглі заказаць звычайную вясковую страву і гарэлку. Была таксама невялікая крама, якую трымаў яўрэй Мэйцік. Яна знаходзілася паміж Гутай і Голбіяй. У краме можна было купіць цукар, цукеркі, гарэлку і посуд. Большы выбар тавараў прапаноўвалі яўрэі ў Варапаеве. Часта на Галбейшчыну наведваліся яўрэі-рызнікі. Праязджаючы праз вёску з аднаго яе канца ў другі, выкрыквалі «Бабы, рыззё, рыззё», а потым вярталіся і бралі тое, што жанчыны выносілі. У Барэйках пражывала некалькі яўрэйскіх сем'яў. Адна з іх трымала краму, дзе прадавалася гарэлка, і паром праз раку Галбяіца, плату за які гаспадар збіраў увосень пасля збору ўраджаю. Даваў яўрэй гарэлку і ў пазыку, але пасля таго, як адзін

www.kamunikat.org

з барэйкаўцаў падбухторыў вяскоўцаў пазыкі не вяртаць, больш такога не рабіў. Гэтага яўрэя, таксама як і леснікоў, потым вывезлі «на белыя мядзведзі».

Хардакова

Асобнай увагі заслугоўвае засценак Хардакова. Тут пасля савецка-польскай вайны атрымалі зямлю два польскія афіцэры-асаднікі: палкоўнік Яцына і капітан Валентынавіч (дарэчы, дзесьці за Галбеяй у накірунку вёскі Куніцкія былі размешчаны ў бараках савецкія ваеннапалонныя часоў савецка-польскай вайны). Яцына быў паранены ў плячо. Па словах Балта Фёдара Фёдаравіча, гэта была амаль драпіна, аднак за гэта раненне асаднік атрымаў 25 га зямлі, больш за валоку (валока — 21,37 га). Дом Яцыны стаяў справа ад сучаснага Хардакова, на ўзгорку. Па ўспамінах Лукашэвіч Станіславы Канстанцінаўны (1919 г.н.), якая ва ўзросце 12 гадоў працавала ў Яцыны нянькай, ён быў жанаты два разы. Першая жонка застрэлілася, бо Яцына любіў «шастаць па дзеўках». Другую жонку звалі Чэся, ад яе Яцына меў дзве дачкі: Яначку і Галіну. Разам з Яцынам жылі яго бацькі і, напэўна, двое дзяцей ад першай жонкі, бо ў сям'і было 8 чалавек. Акрамя зямлі, Яцына меў стаў, у якім разводзіў рыбу (стаў быў крыху вышэй таго месца, чым зараз). Яшчэ ён меў магазін у Варапаева, дзе гандляваў гарэлкай; часам гандляваў гарэлкай і дома. Яцына меў запашнікаў: Казароўца Івана, Пачкоўскага Івана і іншых. Сам асаднік дома бываў рэдка.



Ва ўрочышчы Хардакова

Дом Валентынавіча знаходзіўся амаль каля сучаснага Хардакова. Ягоны зямельны надзел ляжаў бліжэй да Гуты, чым у Яцыны. Было ў яго таксама 25 га. Акрамя зямлі, асаднікі атрымлівалі пенсіі. Родам Валентынавіч быў з Вільні. На святы ў абодвух асаднікаў збіралася шмат гасцей. Калі 3 мая, у дзень прыняцця польскай Канстытуцыі, наладжваўся фэст, Яцына і Валентынавіч апраналі форму, чаплялі шашкі і ехалі на конях або ў Варапаева, або ў Паставы. З пачаткам II сусветнай вайны жонка Яцыны выехала ў Польшчу, а калі з'явіліся бальшавікі, то з'ехаў і сам Яцына. Валентынавіч выехаў раней, прадаўшы зямлю Белі з Сандаміра, які меў чын капітана. У яго сям'і быў сын Багдан і шэсць дачок.

www.kamunikat.org

АД ВЕРАСНЯ 1939 г. ДА ЧЭРВЕНЯ 1941 г.

Першыя саветы

Мясцовыя жыхары бралі ўдзел у палітычным руху, які быў скіраваны супраць польскіх уладаў. У Варапаеве ў пачатку 20-х гадоў у склад утворанай ячэйкі КПЗБ уваходзіў Трус з Васілеўшчыны. Па ўказанню ЦК КПЗБ была створана камсамольская група, якую ўзначалілі браты Казароўцы з Харкоў і Макаршчыны.

Прыход Савецкай улады насельніцтва сустрэла па-рознаму. Частка бяднейшага насельніцтва з Голбіі, Аліхвераў, Вайцяхоў з радасцю вітала новыя парадкі. Былыя паробкі (Гінько і іншыя) — не вельмі, бо разлічвалі атрымаць большую частку панскай зямлі, чым ім далі. Жыхары вёсак Полава, Дуброва з песнямі, гармонікам прыязджалі на луг каля Голбіі касіць (дарэчы, луг лічыўся панскім). Дарэчы, па словах Казароўца Георгія Уладзіміравіча, адзін з калгаснікаў, Мядзюха Філімон (ваяваў на Першай сусветнай вайне), удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях у Петраградзе, сустракаўся з Леніным у Смольным. Потым ён стаў дэпутатам ад сваёй мясцовасці. У гэты перыяд па вёсках новая ўлада наладжвала святочныя шэсці з транспарантамі, чырвонымі сцягамі, песнямі і гармонікам, але спачатку вёска павінна была запрасіць гэта шэсце. Барэйкаўцы таксама віталі бальшавікоў. Там у лесе, яшчэ да верасня 1939 г., з'яўляліся вывешаныя чырвоныя сцягі. Барэйкаўцы (праваслаўныя) казалі жыхарам Вольшнева (католікам): «Нашы прыйшлі, а вашы пайшлі». Жыхары Барэек часткова забралі і засеялі землі вольшнеўцаў. Фёдар Ландышка, засеяўшы ўчастак Янучкоўскага, летам, пасля прыходу немцаў, з'явіўся да былога гаспадара зямлі і спытаў: «Як будзем дзяліць?», на што атрымаў адказ: «Ты засеяў, ты і бяры». Можа, і нездарма ў час прыходу немцаў вольшнеўцы кінулі ў вочы барэйкаўцам: «Чаго чакалі, таго і дачакалі». Аднак ніякай скаргі да немцаў не было. Вольшнеўцаў называлі падкулачнікамі, але не раскулачылі: можа, не захацелі, а можа, не паспелі. Меліся раскулачыць Сальву, альбо Сальвука з Вольшнева. Ён і яго дзве сястры мелі найбольш зямлі ў вёсцы — 40 га. Чалавек хацеў жыць у дастатку, парабкаў не трымаў. Араў на адным кані, а калі конь стоміцца, то, не адпачываючы, запрагаў другога. Сёстры, улёгшы ў працу, замуж не выйшлі, ды і сам ажаніўся ўжо ў гадах. Выратаваў ад раскулачвання Мішута Ягор, сказаўшы ўладам: «Гэта не кулак, гэта — дурак». Камсамольцы, па ўспамінах вольшнеўцаў, прыходзячы на гулянку ў вёску, слухалі, пра што гавораць вяскоўцы, а потым пераказвалі ўладам. Людзей хапалі і вывозілі ў Беразвечча. Дарэчы, у час вайны першымі ў партызаны яны не пайшлі. Калі пачалася нямецкая блакада ў 1943 г., хацелі прымкнуць да партызан, аднак іх не прынялі. Тады яны пайшлі самастойна, і іх пабілі, невядома хто: альбо немцы, альбо самі партызаны, не давяраючы ім. Два камсамольцы пахаваны ў Барэйках, астатнія — у вёсцы Грыблы. Нікога не раскулачылі ні ў перадваенны, ні ў пасляваенны час у Манеўшчыне, Васілеўшчыне, Харках. Аднак на заможных людзей былі накладзены вялікія падаткі. Так, вольшнеўцы павінны былі здаваць малако, збожжа, воўну, і ўсё роўна заставаліся даўжнікамі дзяржавы.

З Галбейскага сельсавета некалькі чалавек (у тым ліку і з Вольшнева) накіравалі на будаўніцтва аэрадрома ў Сувалках, дзе тыя і загінулі ў час нападу фашысцкай Германіі.

Грамадска-палітычнае становішча пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР было даволі складаным. Масавыя рэпрэсіі, якія лютавалі ў Савецкім Саюзе, распаўсюдзіліся і на тутэйшую тэрыторыю. Акрамя пацярпелых леснікоў, былі рэпрэсаваны і іншыя бязвінныя людзі.

Пра той час старыя жыхары казалі: «Першыя саветы былі лепшыя, бо хутка пайшлі».

www.kamunikat.org

ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА

Пачатак вайны

Першым з Галбейшчыны, хто сустрэўся з немцамі ў пачатку другой сусветнай вайны, быў Болт Ф.Ф. Ён у той час працаваў на шклозаводзе ў Сандаміры. Пасля захопу горада немцамі, Болт Ф. Ф. захацеў паехаць дадому. Немец, уладальнік завода, сказаў, што адпусціць пасля таго, як адпрацуе. Гаспадар стрымаў слова, і Болт Ф.Ф. вярнуўся дахаты. Рускія на мяжы не затрымалі.

Нямецкія самалёты з'явіліся ў небе над Гутай-Голбіяй ужо ў першы дзень вайны. Вяртаючыся з танцаў з Аліхвераў у нядзелю, 22 чэрвеня, Болт Ф.Ф. іх бачыў. На аўторак яму і яшчэ некалькім жыхарам была дадзена павестка з'явіцца ў ваенкамат у Дунілавічы, узяўшы з сабой харчу на 3-4 дні. У аўторак у ваенкамаце ужо нікога не было, толькі парваныя паперы і пабітыя пласцінкі. Бачылі ў Дунілавічах на аўтамабілі камандзіра Чырвонай Арміі. Вяртаючыся назад, у той жа дзень у Варапаеве сустрэлі немцаў. Афіцэр вермахту праверыў, ці стрыжаныя яны. Болт Фёдар казаў, «...добра, што не пастрыгліся налыса, бо стрыжаных бралі ў палон і адпраўлялі ў Беразвечча». Немец аддаў загад: «Цурук», гэта значыць, каб вярталіся дахаты. Хто прыйшоў у панядзелак у ваенкамат, тыя дайшлі да Круляўшчызны, і іх там разбілі.

Вось як успамінае пачатак вайны Красоўскі Аркадзь (1911 г.н.), на той час жыхар вёскі Алашкаўшчына: «22 чэрвеня 1941 г. быў я з жонкай на хрэсьбінах дзіцяці жончынай сястры. Накрылі стол і сталі святкаваць. Як раптам загрухатала ў небе. Людзі пачалі ўглядацца ў неба праз вокны. Гэта былі самалёты. Жыхары вёскі адразу дагадаліся: «Немец напаў». Ужо ў аўторак стала вядома, што захопнікі ўжо ў Варапаеве. Хутка яны з'явіліся і ў Алашкаўшчыне».

На Гуту немцы завіталі праз некалькі тыдняў пасля пачатку вайны. Былым парабкам было загадана хадзіць на працу так, як і пры графе. У доме надлеснага стаў жыць вартаўнік-галандзец з вінтоўкай. Немцы ў 1941 г. куплялі яйкі, масла, загаралі. Насельніцтва было абкладзена падаткам. Трэба было здаць, у залежнасці ад дастатку, карову або іншую жывёлу. Адна сям'я з Вольшнева павінна была здаць 2-х кароў, хоць па колькасці едакоў была вялікая. Па іх просьбе немцы зменшылі падатак і забралі толькі адну карову.

У вёску Манеўшчына зайшлі, адстаўшы ад сваіх, 3 салдаты Чырвонай Арміі. Пра гэта даведаліся немцы і захапілі іх у палон. Потым адправілі ў канцлагер у Беразвечча. Жыхары Манеўшчыны не пацярпелі.

У Гуце немцы былі не вельмі часта. Прыязджалі некалькі чалавек на матацыклах правяраць, як ідзе праца на былых панскіх землях. Паліцыя была часцей: 4-5 чалавек 2-3 разы ў тыдзень. Часам хадзілі па вёсцы нецвярозыя і стралялі. З 21 гадзіны дзейнічала каменданцкая гадзіна: каго сустракалі пазней — білі дубцамі.

Партызанскі рух

У 1942 г. немцы ў Гуту малой колькасцю не прыязджалі, бо ўжо з'явіліся партызаны. А калі ўсё ж наведваліся, то абавязкова высылалі дазор у два бакі ў лес ад дарогі на 100 метраў. У 1942 г. партызаны разбілі нямецкі абоз, пасланы за харчам, на тым месцы, дзе зараз жыве Дзіковіч Аляксандр. Тады партызаны паставілі кулямёт на супрацьлеглым узгорку і на чыгуначным пераездзе. Пасля бою немцы толькі ноччу змаглі забраць сваіх 3–4 параненых. Потым партызаны завалілі лесам дарогу Гута — Варапаева. Але немцы праязджалі чыгункай ці дарогай з Лапачонкаў, што на супрацьлеглым беразе возера. Тым жа 1942 годам 28 немцаў-веласіпедыстаў ехалі з Гуты ў Куніцкія за правізіяй. Іх сустрэлі кулямётным агнём два партызаны: Сафрон і яшчэ адзін невядомы. Сафрон страляў з-пад

www.kamunikat.org

печы ў Куніцкіх, а другі партызан — з Вайцяхоў. Немцы, страціўшы двух параненых, адступілі. У той жа год партызаны спалілі галбейскі мост праз раку Галбяіцу. Аднак немцы, разабраўшы чыюсьці лазню, за 2 гадзіны яго аднавілі.

З прычыны недахопу толу партызаны разбіралі чыгункі. Але немцы хутка іх аднаўлялі. Тады пачалі складваць шпалы, на іх клалі рэйкі і падпальвалі. Рэйкі гнуліся і станавіліся непрыдатнымі для чыгуначнага палатна. У партызаны з Гуты пайшлі Болт Фёдар, Яркоўскі, Драгун. З Барэек — Ландышка Фёдар, Мядзюха Пётр.

Фрагмент карты, на якой паказаны знішчаныя партызанамі фашысцкія гарнізоны ў Гуце і Голбіі

У 1942 г. немцы рыхтаваліся вывезці моладзь у Германію. Адкупіцца можна было, паабяцаўшы вырошчваць табаку, узяўшы насевак у немцаў. Моладзь з Вольшнева так і зрабіла. Табака вырасла вялікая, аднак партызаны запатрабавалі здаць ім. З Манеўшчыны, Вольшнева ў партызаны ніхто не пайшоў, але дапамогу ім аказвалі. Выпякалі хлеб: днём патрабавалі немцы, а ноччу партызаны.

Балта Ф.Ф. некалікі разоў спрабавалі вывезці ў Германію, аднак яму ўдалося збегчы. Першы раз з Дунілавіч, куды трэба было з'явіцца па па-вестцы, прысла-най з Варапаева. За няяўку можна было атрымаць 25 гумовых палак. У Дунілавічах трымалі 4–5 дзён, не кормячы. Жылі тым, што ўзялі з дому. Другі раз збег з Варапаева, трэці раз — з Пастаў, дзе трымалі на плошчы пад аховай немцаў і паліцаяў. Вуліцы, якія вялі да плошчы былі застаўлены казламі з калючым дротам. Толькі саскочыўшы са страхі склада, які раней належаў яўрэю, з вышыні 5 метраў, пераплыўшы раку (а ўжо была восень), Балту Фёдару і яшчэ 3 чалавекам удалося збегчы. Потым ён уступіў у партызаны. У атрадзе не было батарэек для радыёлы, каб слухаць Маскву. Тады партызаны (каля 15 чалавек) абступалі'



Легітымацыя (пашпарт) часоў акупацыі

www.kamunikat.org

яе, моцна сціскалі антэну, радыёла зараджалася, і можна было слухаць паведамленні. Праўда, дынамік гаварыў ціха, але пачуць было можна. У час з сярэдзіны 1942 года да канца 1943 партызаны з атрада, у якім ваяваў Болт Ф.Ф., некалькі разоў хадзілі праз Казьянскі лес (вялікія абшары балотаў) у бок Ленінграда за боепрыпасамі. Звычайна ў далёкі шлях выпраўлялася каля 40 чалавек на чале са старшым лейтэнантам Мацьковым. Кожны з партызан браў па 32 кг боепрыпасаў і прадукты. Пры вяртанні назад часта даводзілася выкідваць чацвёртую частку ношы, бо дарога была далёкая і цяжка было несці. Неаднаразова ў Казьянскім лесе адбываліся сутычкі з немцамі. Перастрэлкі доўжыліся 2-3 гадзіны. Пасля бою партызаны (па словах Балта Ф.Ф) збіралі сваіх забітых і цяжка параненых байцоў у кучу і спальвалі. Знізу клалі параненых, а наверх — забітых. Гэты жахлівы факт, напэўна, адбываўся з мэтай недапушчэння паланення партызан немцамі, каб тыя не выведалі месцазнаходжанне атрада. Нярэдка было так, што з атрада на базу вярталіся толькі некалькі партызанаў.



Пастаўскі Павет
волаcьць _____

Павестка №_____

Грамадзянину _____ праж. у _____
Вы павінны выпаўняць работы на працоўнаму ўчаску ў дарожным будаўніцтве ў 1942 г.
Чалавека-дзён _____ Падвода-дзён _____
У сувязі з гэтым загадваецца Вам выпаўняць наступныя работы:

Назоў работы	Месца працы	Термін выканання працы: пачатак	канец	Вымерэнне	Колькасць работ	Норма выпрацоўкі ў дзень	За выкан. работ будзе зал.: чал-дзен	пляц.-дзен

Старшыня сельсавета _____

Павестка на выкананне работ у дарожным будаўніцтве 1942 г.

У раёне Дубровы ў сакавіку 1943 года па ініцыятыве камандзіра атрада Аншанікава ўзнікла пляцоўка для прыёму боепрыпасаў. Днём тут партызаны капалі яму, засыпалі галінкамі, а ноччу запальвалі вогнішча, каб савецкім лётчыкам было бачна, куды трэба скідваць бочкі (у іх знаходзіліся медыкаменты, боепрыпасы, ежа і іншае). Потым знайшоўся здраднік, які выдаў немцам месцазнаходжанне пляцоўкі.

Дзейнічалі ў нашай мясцовасці і «партызаны»-рабаўнікі. Нейкі час так «змагаўся» атрад Панамарэнкі, які потым быў разбіты. Па ўспамінах Янучкоўскай Ганны Вікенцьеўны, аднойчы да іхняй хаты пад'ехаў на кані п'яны партызан. Ён, клацаючы затворам, патрабаваў прынесці каляровыя дываны. Янучкоўская прынесла некалькі з іх, але яму тыя не спадабаліся. Потым сказала, што сходзіць за дыванамі ў кладоўку, а сама выбегла на вуліцу і схавалася ў крапіве. Тады падышло яшчэ некалькі партызан, пакінуўшы аднаго для варты каля таго месца, дзе схавалася Янучкоўская. Селі есці, паклікалі часавога. Толькі тады яна выйшла з крапівы. А конны тым часам некуды знік. Седзячы ў крапіве, жанчына думала, што калі пачуе стрэлы, то выйдзе, каб забіваў і яе, а не толькі бацькоў. Прыкладна пра тое ж самае паведаміў і Красоўскі Аркадзь: «Не партызаны, а сапраўдныя бандыты, яшчэ горшыя за немцаў. Калі хто-небудзь скардзіўся на такіх партызан іх камандзіру, тых чакаў адразу расстрэл. Але гэта мала каго палохала. Усё роўна прыходзілі ноччу з лесу, забіралі скаціну, харчаванне, адзенне. Такія нават актыўных дзеянняў супраць немцаў не вялі. Потым, ужо пасля вайны, людзі бачылі на іх жонках сваё адзенне. Тыя, хто па—сапраўднаму абараняў Радзіму, калі і заходзілі ў вёску, то за кавалкам хлеба і сала ды за флягай вады. Калі яны заходзілі ў хату, то пыталіся: «Гаспадары, ці не маглі б вы даць нам, партызанам, што-небудзь, бо мы галодныя?» Нават калі гаспадар адказаў бы ў ежы, а партызаны ведалі, што яна ёсць, яны б больш не прасілі і не забіралі, а проста сабраліся б і пайшлі».

Акрамя немцаў, у акупацыйную армію ўваходзілі атрады літоўцаў. Нейкі час у дунілавіцкіх лясах літоўцы на чале з Літвіцкім не

www.kamunikat.org

давалі спакою партызанам. Каля Голбіі яны ахоўвалі чыгуначны мост праз Шурыцу. Там знаходзіуся іх бункер, траншэі. Камандзірам літоўскага атрада быў немец-афіцэр, яшчэ адзін немец быў яго ад'ютантам. Партызаны ў 1942 г. каля Майдана чакалі іх праезд на Варапаева, аднак яны паехалі на Шаркаўшчыну. Літоўцы таксама ахоўвалі мост у Бельках. Адтуль часам ездзілі па вёсках за харчам, былі і ў Вольшневе. Жадаючых стаць старастам у гэтай вёсцы не знайшлося, таму кожны гаспадар павінен быў збіраць падаткі, малако, масла, яйкі для немцаў і літоўцаў.

Трагедыя Хардакова

У канцы восені — пачатку зімы, калі ўжо ўсталяваўся мароз і ляжаў снег, была спалена вёска Хардакова разам з жыхарамі. Ёсць дзве версіі, чаму немцы спалілі вёску: паводле адной, яны шукалі польскага палкоўніка, сваяка Белі, які тут хаваўся, па другой — палічылі, што ў вёсцы шмат дзяцей і гэта, напэўна, дзеці партызан. Група немцаў каля 30 чалавек з некалькімі афіцэрамі з рацыяй прыйшла з Варапаева. Яны сагналі людзей у два дамы. Каго расстралялі, а каго спалілі жыўцом. Бяда напаткала Пачкоўскага Валерыя Сямёнавіча і яго двух сыноў: Ананія (1926 г.н.) і Дзмітрыя (1932 г.н.). Яны ў гэты час нарыхтоўвалі каля Хардакова лес на хату. Адзін немец праз перакладчыка загадаў ім ісці дадому. Як толькі яны пачалі пераходзіць ручай, што цячэ каля Хардакова, то іх заўважыў другі немец. Параіўшыся з астатнімі, фашыст паклікаў іх да сябе і ўсіх разам павялі да Хардакова. Ананій з братам спрабавалі ўцячы, але салдаты іх дагналі. Прывялі да хаты Яцыны. Спачатку немцы расстралялі ў хаце сям'ю Белі, а Пачкоўскіх тым часам трымалі на ганку. Потым завялі і іх. Запомнілі, што немец, які страляў, меў закасаныя рукавы, а за спіной — банку з бензінам. Спачатку стрэлілі ў бацьку, але так атрымалася, што Валерый Сямёнавіч упаў раней стрэлу і прыкінуўся забітым. Потым стрэлілі ў Ананія. Ранены, ён быў адкінуты куляй, закаціўся пад лаўку і страціў прытомнасць. Куля ўвайшла пад лапаткай, а выйшла праз шыю ў галаву, таму вока

не бачыць з той пары. Малодшы сын Валерыя Сямёнавіча быў адразу забіты. Карнікі закрылі дзверы і падпалілі дом. Каб ён хутчэй разгараўся, пачалі біць вокны. Дзвюх дзяўчат, якія хацелі выскачыць праз акно, укінулі штыкамі назад. Бацька Пачкоўскіх здагадаўся: калі каля сябе акно выб'еш сам, то немцы сюды не пойдуць, палічыўшы, што там нехта ўжо ёсць. Выбіў сякерай акно і выскачыў з хаты, якая ўжо гарэла. Ён думаў, што абодва сыны забітыя, аднак раптам пачуў, хто нехта ў хаце заварушыўся. Вярнуўшыся, бацька вывеў з хаты цяжкапараненага сына Ананія, на якім ужо гарэла фуфайка, і Багдана, сына Белі, гаспадара другога дома. Хаваючыся ў дыме, яны пачалі ўцякаць у бок Гуты. На чыгунцы стаялі немцы з кулямётам, але пад мостам уцекачам удалося праскочыць. Перачакаўшы дзень каля школы, яны пад вечар пераправіліся праз Галбяіцу каля гарадзішча ў Голбію. Старэйшаму Пачкоўскаму ў той час было 57 гадоў, а яго сыну Ананію — 10. Потым Валерыю Сямёнавічу прыйшлося аддаць доктару кабана, каб той таемна лячыў сына. Урач аказаўся прыстойным чалавекам і не выдаў хлопца, хоць абавязаны быў паведамляць немцам пра кулявыя раны.

Усяго ў Хардакове загінулі 23 чалавекі, у тым ліку сям'я Белі і яшчэ адзін чалавек, знойдзены згарэлым ў вазоўні. Магчыма, гэта той самы польскі палкоў-нік, якога немцы і шукалі. Сын Белі ацалеў, бо сядзеў пад печкай, а калі пачалі паліць хаты, то выскачыў праз акно і ўцёк разам з Пачкоўскімі. Касарэўская Крысціна казала, што хлопчык прыйшоў да іх у вёску Голбія і яе маці Зося Багдана схавала. Карнікі ж забралі з Хардакова каля 15 кароў.

Немцы хацелі спаліць і Гуту. Аднак у вёсцы з часоў I сусветнай вайны жылі два немцы: Герман (меў жонку з Васілеўшчыны, дачку і сына) і Вільям (меў жонку, таксама з Васілеўшчыны, і двух сыноў). Гэтыя немцы прыбеглі ў Хардакова, папрасілі не паліць Гуту і Голбію. Вярнуўшыся ў вёску, Герман сказаў, што Багдана Белю трэба адвесці да немцаў, інакш фашысты вёскі спаляць. Атрад карнікаў тым часам размясціўся ў хаце Івана Пачкоўскага, якая стаяла на тым месцы, дзе зараз хата Алега Касарэўскага. Туды ж і прывялі хлопчыка. Фашысты далі яму цукерак, кінулі палку і загадалі: «Бяжы на лужок». Калі малы пабег, карнікі яго расстралялі. Сам Беля ў той

www.kamunikat.org

Помнік у Хардакове

час адсутнічаў. Ён быў на стойцы — гэта значыць ехаў на кані, куды немцы загадаюць. У Белі акрамя адзінага сына было 6 дачок, і ўсе яны загінулі ў полымі. Беля хацеў выратаваць сына і паехаў да немцаў, хоць яму і казалі, што ён нічым не дапаможа. Хлопчык у той час ужо быў забіты і ўкінуты ў раку паміж галбейскім мостам і месцам, што завецца Касцюкова. Потым хлопчыка выбілі з лёду і пахавалі. Калі ж Беля прыйшоў да немцаў, каб выратаваць сына, тыя загадалі яму ехаць разам з імі, але, не даязджаючы да могілак, загадалі злезці з падводы і застрэлілі. Галбеец Тумаш сказаў, каб не хавалі на могілках; магчыма, баяўся немцаў, і Белю пахавалі каля канавы. Пазней перапахавалі.

Актывізацыя партызанскага руху

У 1943 г. дзеянні партызан актывізаваліся. У той час на Галбейшчыне знаходзіўся партызанскі атрад пад кіраўніцтвам Шуткевіча. Лагер партызанаў месціўся ва ўрочышчы *Чырвоны* Бор, што знаходзіцца паміж вёскамі Гута і Балаі. Аднойчы партызаны разам з вясковымі мужыкамі разабралі чыгунку за мастом праз раку Шурыца.

Рэчы часоў вайны
(з музея Гуцкай школы)

Партызаны часта заходзілі ў вёску Голбія за ежай. Адным разам Шуткевіч са сваімі двума баявымі таварышамі ўбачыў у адной з вясковых хат літоўцаў. Ён хацеў кінуць праз акно гранату, але адзін з мясцовых жыхароў яго адгаварыў, бо ў хаце знаходзіліся дзеці. Тым не менш, сутычка адбылася. Адзін з літоўцаў быў цяжка паранены і хутка памёр. Гэтыя падзеі адбыліся дзесьці ў маі 1943 года. А ў чэрвені таго ж года аднойчы ранкам па вёсцы з боку гарадзішча Голбія было выпушчана некалькі мін з мінамёта. Адна з іх знесла дах дома, другая засела ў сцяне не разарваўшыся. Некаторыя жыхары спрабавалі збегчы з вёскі, але іх акружылі немцы. Усіх вярталі назад. Жыхароў вёскі прымусілі на могілках капаць вялікую яму. На шчасце, адзін з мясцовых жыхароў — немец, які жыў у вёсцы з часоў першай сусветнай вайны; па другой версіі гэта быў нехта з роду Пачкоўскіх (найбольш распаўсюджанае ў Голбіі прозвішча), які ведаў нямецкую мову — уступіў у перамовы з афіцэрам. І вёску пашкадавалі. Немец загадаў сабраць воз яек, курэй. Жыхары сабралі шмат. Прыехала машына, на якую ўсё пагру-зілі. Нямецкі афі-цэр сказаў, што галбейцам пашчасціла, па-колькі партызаны забілі літоўца, а не немца.

У гэтым жа годзе ў Барэйках стаяў партызанскі атрад Ловіна. «Партызаны»-рабаўнікі ўжо больш не наведваліся. У гэты час барэйкаўцы, відаць, нядрэнна жылі, бо ў вёсцы ладзіліся танцы. Адзін п'яны партызан спрабаваў заехаць на кані ў хату, дзе моладзь весялілася.

Немцы заходзілі ў вёскі значна радзей, а калі і былі, то, як казалі манеўшчынцы, «і па патрэбе баяліся зайсці за вугал». У партыза-

www.kamunikat.org

наў у Балаях была пякарня, там жа знаходзілася пляцоўка, куды з самалётаў скідвалі грузы.

Акаўцы

Дзесьці ўвосень 1943 г. адбылася сустрэча савецкіх партызан з польскімі партызанамі Арміі Краёвай. Атрад акаўцаў стаяў на Казінай гары каля Лапачонкаў і складаўся ў асноўным з мясцовых жыхароў. Ловін, камандзір атрада савецкіх партызан, і камандзір акаўцаў як бы пасябравалі. Камандзір АК наведаў Барэйкі, хадзіў па вёсцы, выглядаў, дзе пасты. Антось з Якімаўцаў быў засланы партызанамі да акаўцаў. Прыйшоў да іх Антось, як бы ўцёк, змокшы, яны яго ў пуні паклалі, укрылі. Даведаўшыся пра іх планы, Антось расказаў партызанам. Аднойчы ўвечары партызаны напалі на акаўцаў. Камандзіра АК ранілі. Акаўцы не хацелі здавацца, аднак партызаны частку польскіх легіянераў застрэлілі, іншых узялі ў палон. Камандзіра і яшчэ двух чалавек прывезлі ў Барэйкі. Допыт вёў палітрук Танканог. Перавязку раненым зрабіў урач-яўрэй. Калі пачалася нямецкая блакада, партызаны выехалі з Барэек і ў Белятаве расстралялі польскага камандзіра. «Чэлядзь толькі цэльна», — сказаў перад смерцю камандзір АК. Бацька Адама Качана яго закопваў па загаду партызан, бо яго хутар знаходзіўся непадалёку ад павароту на Барэйкі, улева ад дарогі на Белькі.

Блакада

У жніўні — пачатку верасня 1943 г. партызаны, адстрэльваючыся цэлы дзень, вывезлі частку зерня з Двара, а тры стагі спалілі. На наступны дзень прыйшлі немцы, якія вялі блакаду партызанскіх раёнаў. Яны акапаліся там, дзе зараз знаходзіцца Гуцкая сярэдняя школа. Іх было 300–400 чалавек, мелі яны дзве гарматы. Запальнымі снарадамі яны спалілі завод. У час блакады вялася бамбардзіроўка з паветра: скідвалі бомбы каля Балаёў, за Шурыцай, каля майданскай пілярамы. Партызаны адстрэльваліся каля чыгункі, крыху раней спаліўшы мост у Двары.

Увосень 1943 г. фашыстамі ў адзін дзень былі спалены вёскі Кеўлічы, Стахоўскія, Паўлюгі, Барэйкі. Вольшнева, Голбія, Гута — пазней. Жыхароў Вольшнева выселілі ў пятніцу ці ў суботу, а вёску спалілі ў панядзелак, на Пакроў. Гэтыя некалькі дзён немцы ў Вольшневе стаялі лагерам. Адзін літовец, які суправаджаў тых, каго выводзілі, сказаў, каб Янучкоўская Ганна бегла ў лес, але тая адмовілася, бо баялася, што ў лесе яе могуць забіць. Янучкоўскую вывезлі ў Германію, яна працавала там на ваенным заводзе. Вёска Манеўшчына таксама была спалена. Жыхары вёскі кажуць, што гэта было ў пятніцу. У гэты дзень у вёсцы забілі мужчыну каля кладкі, а старая жанчына згарэла разам з хатай. Васілеўшчыну спалілі напалову. Харкі і Куніцкія не кранулі, бо з гэтых вёсак ніхто не пайшоў у партызаны. Шмат хто са старэйшых кажа, што прыйшоў загад Гітлера больш не паліць вёскі. Можа, так і было. Перад тым як спаліць Барэйкі, немцы стаялі ў Вольшневе. Барэйкаўцы паспелі схаваць сваё дабро ў лесе, выстаўлялі назіральнікаў, каб папярэдзіць вяскоўцаў, калі немцы рушаць да вёскі.

У хуткім часе пасля сутычкі партызан атрада Ловіна з атрадам АК сам Ловін быў зняты з пасады кіраўніка атрада, бо павёў партызан не на ўсход, як было загадана, а на Грыблоўскі мох, дзе шмат партызанаў пабілі. Рэшта прарвалася праз р.Дзісна (каля 2 тыс. чалавек пад кіраўніцтвам П. М. Машэрава) недалёка ад Казьян і пайшла ў накірунку Ушач. Прарыў адбываўся ў ледзяной вадзе. Пасля заканчэння нямецкай блакады партызаны вярнуліся, а ў ліпені 1944 г. злучыліся з Чырвонай Арміяй каля Норыцы.

На работы ў Германію

Жывёлу са спаленых вёсак немцы забіралі, а маладзейшых жыхароў вывозілі ў Германію. Па ўспамінах Мішуты Мілеці, яго таксама разам з бацькам у складзе коннага абозу спрабавалі вывезці.

www.kamunikat.org

Ліст з фронту

Не даехаўшы «калена» на Гуце, іх абоз сустрэўся з нямецкім грузавым аўтамабілем. Скарыстаўшы момант, бацька Мілеці аддаў воз слепа-глухому возчыку Мядзюху Валерыю (ён пры Польшчы спрачаўся з яўрэямі за зямлю і тыя паабяцалі, што ён аслепне), а сам уцёк. Калёсы былі ў сярэдзіне, конь пайшоў сам. Усяго збегла 7 чалавек. Аж з-пад Даўгаўпілса збег жыхар Голбіі Пачкоўскі Мікалай і два жыхары вёскі Куніцкія.

Насельніцтва Манеўшчыны так-сама збіраліся вы-везці. Людзей спа-чатку размясцілі ў Варапаеве ў пан-скім двары за агароджай для скаці-ны. Старэйшых з Манеўшчыны ад-пусцілі, але папярэдзілі, каб у вёску не вярталіся. Манеўшчынская моладзь уцякла, а іх аднагодкаў з Харкаў і Лапачонкаў усё ж вывезлі.

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО КОМАНДИРА ЧАСТИ

Пахаронка

Калі Ананія Пачкоўскага вывезлі ў Германію, то яму было ўсяго 11 гадоў. Як гэта рабілася? Усю сям'ю па павестцы выклікалі ў Дунілавічы быццам бы для атрымання дакументаў. Бацькоў потым адправілі дадому, а моладзь — у Германію. З Рэйха Ананій прыслаў дадому ліст, у якім расказаў пра сваю «адысею». Спачатку везлі на цягніку ў Глыбокае, але партызаны ўзарвалі рэйкі. Тады немцы выклікалі браняпоезд. Апынуўся Ананій у Карпатах, на вышыні каля 3 км. Там займаўся нарыхтоўкай лесу, аж пакуль партызаны не разбілі немцаў. Потым яшчэ год капаў акопы на югаслава-харвацкай мяжы. Там у 1945 годзе выпадкова сустрэўся з немцамі і літоўцамі, якія ахоўвалі мост праз раку Шурыца каля Голбіі. Вярнуўся дадому, калі вызвалілі савецкія войскі.

Апошнія эпізоды вайны

Галбейшчыну вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 4 ліпеня 1944 г. Жыхар Манеўшчыны Балай Уладзімір памятае, як перакулілася некалькі падвод з боепрыпасамі адной з часцей Чырвонай Арміі. Гэта адбылося па той прычыне, што ноччу ў Варапаеве ўзарвалі стаў, узровень ракі падняўся, і не было бачна вялікіх камянёў. У Кейзіках у гэты час падарваўся на міне савецкі танк. У 1953 г. таксама ў Кейзіках узарваўся гусенічны трактар С-300. Загінулі 3 чалавекі, аднаму з іх выбухам адарвала галаву. На васілеўшчынскім полі немцы паставілі шмат мін, і на адной з іх падарвалася старая жанчына. Яна загінула, конь быў паранены. Ужо праз шмат гадоў пасля вайны каля чыгункі насупраць Васілеўшчыны пры нарыхтоўцы сена падарваўся грузавы аўтамабіль, але, на шчасце, ніхто не пацярпеў. У ліпені 1944 г. каля Вольшнева быў забіты немец. Ён паказваў фотаздымкі двух малых дзяцей, аднак яго не пашкадавалі.

Помнік на Гуце «Вечная слава Героям 1941-1945» (зараз не існуе)

У пасляваенны час зрабілі больш якасную дарогу Гута — Варапаева. Кожны гаспадар навакольных вёсак павінен быў 6 дзён вазіць на сваім кані каменне і выкладваць ім дарогу.

www.kamunikat.org

ПАСЛЯВАЕННАЕ ЖЫЦЦЁ

Падзел зямлі

Адным з першых распараджэнняў Савецкай улады адразу пасля вызвалення Галбейшчыны ад нямецкіх захопнікаў была пастанова Дунілавіцкага райсавета «О уборке и использовании посевов бывших хозяйств немецких оккупантов и бросовых». Вось 4-ы пункт гэтай пастановы:

«В области имеются крестьянские семьи партизан, военнослужащих и другие пострадавшие от оккупантов и не имеющих посева. Окажите этим семьям помощь посевами за счет бросовых посевов лиц, бежавших с немецкими оккупантами в пределах норм: озимых культур 0,15–0,20 га, яровых зерновых и картофеля 0,40–0,50 га на семьи.

26.07.44 г. *Секретарь Райсовета Лаптев».*

Паводле гэтай пастановы з вёскі Гута 11.08.44 г. 0,21 га жыта атрымаў Радзон Іван, які меў сям'ю з трох чалавек, і 0,20 га жыта — Кавалёнак Ганна з чатырма чалавекамі ў сям'і. Паколькі яны назваліся неадукаванымі, то за іх заяву пісала Ратанчук Марыя. Перад імі 6 жніўня 0,20 га жыта выдзелілі Касарэўскай Дэльфіне, якая мела сям'ю толькі з двух чалавек, але муж састаяў у партыі камуністаў. Мядзюху Францу Юльянавічу з вёскі Рагоўскія, які меў сям'ю з чатырох чалавек, і Касарэўскаму Паўлу Якубавічу 4.08.44 г. адмовілі ў дапамозе.

Калектывізацыя

У 1949 г. у Заходняй Беларусі пачалася калектывізацыя. У Глыбоцкім архіве захоўваецца «Статут сельскагаспадарчай арцелі». Вось некалькі выпісак з гэтага статута:

«Трудящиеся крестьяне Голбейского с/с Дуниловического р-на, Полоцкой обл. добровольно объединяются в с/х артель, чтобы общими средствами производства и общим организованным трудом построить коллективное, т.е. общественное хозяйство, обеспечить полную победу над кулаком, над всеми эксплуататорами и врагами трудящихся, обеспечить полную победу над нуждой, над отсталостью мелкого единоличного хозяйства, создать высокую производительность труда и обеспечить таким образом лучшую жизнь колхозников.

Колхозный путь, путь социализма, есть единственный правильный путь для трудящихся крестьян. Члены артели обязуются укреплять свою артель, трудиться честно, делить колхозные доходы по труду, сохранять общественную собственность, беречь колхозное добро, беречь тракторы и машины, установить хороший уход за конём, выполнять задания своего рабоче-крестьянского правительства, — и, таким образом, сделать свой колхоз большевистским и всех колхозников зажиточными.

Размеры приусадебной земли, находящиеся в личном пользовании колхозного двора (не считая земли под жилыми постройками) могут колебаться от 0,30 до 0,60 га.

Единый земельный массив артели ни в коем случае не должен уменьшаться. Наделение бывших членов артели землёй за счет земельной площади артели — воспрещается».

Па ўставу бачна: калі калгаснік пажадае выйсці з арцелі, то сваю зямлю назад не атрымае.

«Обобществляется: весь рабочий скот, с/х инвентарь (плуг, сеялка, борона, молотилка, косилка), семенные запасы, кормовые средства в размерах, необходимых для содержания обобществлённого скота, хозяйственные постройки, необходимые для артельного хозяйства, и все предприятия по переработке продуктов сельского хозяйства.

www.kamunikat.org

Не обобществляются и остаются в личном пользовании колхозного двора: жилые постройки, необходимые для содержания скота, находящиеся в личном пользовании колхозного двора артели, мелкий с/х инвентарь, потребный для работ на приусадебной земле.

Из обобществлённого рабочего скота правление артели в случае необходимости выделяет несколько лошадей для обслуживания за плату личных нужд членов артели.

Каждый колхозный двор в личном пользовании может иметь две коровы, до двух голов молодняка рогатого скота, одну свиноматку с приплодом или, если правление колхоза найдет необходимым, 2 свиноматки с приплодом, до 20 овец и коз вместе, неограниченное количество птиц, кроликов и 20 ульев.»

У вёсцы Голбія калгас узнік 18 кастрычніка 1949 г. У яго ўвайшло 38 гаспадарак. Магчыма, у Голбіі планавалі стварыць калгас раней, бо ў Глыбоцкім архіве маецца план мерапрыемстваў па арганізацыйнаму ўмацаванню і падрыхтоўцы калгасаў да вясенняга пасеву, які датуецца вясной 1949 г., або ў дакумент закралася памылка. Вось гэты план:

«До 1 июня 1949 г. произвести нарезку полей девятипольного севооборота, укрепить существующие звенья, произвести закрепление за звеньями земельных участков и с/х инвентаря. Вывезти на поле от членов колхоза к 05.04.49 г. 500 тонн навоза. Заготовить и вывезти на поле к этому же числу для удобрения 350 тонн торфа, собрать золы 6 тонн, птичьего помета 5 центнеров, завести минеральных удобрений 3 тонны. Довести до полной кондиции весь семенной фонд. Закончить строительство конюшни к 15 марта 1949 г., построить общественный амбар на 150 тонн к 15.06.49 г. Построить скотный двор на 40 голов до 02.09.49 г. Увеличить поголовье лошадей за счет приплода на 12 %. Приобрести жеребца производителя. Организовать ферму крупного рогатого скота в количестве 30 голов за счет закупа, организовать свиноферму в количестве 12 голов и овцеферму в количестве 10 голов. Добиться урожайности по зерновым культурам не ниже 12 центнеров с 1 га, льносемя 4 центнера с 1 га, льноволокна 5 центнеров, картофеля — 130 центнеров. Произвести посев многолетних трав на площади не менее 5 га, организовать колхозный плодопитомник на площади 1 га».

Праца на шклозаводзе «Гута»

Рабочыя шклозавода «Гута» (60-я гады)

www.kamunikat.org

На будоўлі хаты на вул. Завадской, в. Гута, 1959 г.

У галбейскі калгас увайшлі дзве вёскі: Голбія і Аліхверы. Таксама быў арганізаваны 12 мая 1949 г. калгас у вёсцы Харкі, які атрымаў назву імя Варашылава. Акрамя вёскі Харкі ў калгас уваходзіла вёска Манеўшчына. Калгас меў плошчу 220 га і налічваў 72 калгаснікі. Кіраўніком сельгасарцелі быў абраны Гарус Нікадзім Іосіфавіч. 19 лістапада 1949 г. узнік калгас у вёсцы Барэйкі, які атрымаў назву імя Крупскай. Ён складаўся з 27 сялянскіх гаспадарак, і ўваходзіла ў яго 53 чалавекі. Жыхары вёскі Вольшнева не захацелі ўступаць у калгас у 1949 г. Аднак у іх адабралі зямлю, і давялося ўступіць у 1950 г. Калгас быў і ў вёсцы Барэйкі. У пасляваенны час калгасы звычайна ствараліся з некалькіх вёсак.

Гуцкі шклозавод пачаў адбудоўвацца ў 1946-47 г.г. сіламі мясцовых жыхароў. Працавала на ім тады каля 35 чалавек. На дапамогу быў прысланы ўзвод салдат. Па ўспамінах Балая Уладзіміра, у непагадзь была вялікая гразь, што машыны «садзіліся», на заводзе хадзілі ледзь не ў рыбацкіх ботах. Аднак паступова ўсё наладзілася.

ДАДАТКІ

1. Спіс рэпрэсаваных савецкай уладай у 1939-1941 гг.

Казаровец Зіновій Мікалаевіч, 1892 г.н. Месца нараджэння — вёска Казароўшчына, беларус, з сялян, граматны, бракёр Варапаеўскага лясніцтва, месца жыхарства — вёска Казароўшчына. Меў жонку і сына. Арыштаваны 1 студзеня 1940 года, асуджаны 21 мая 1941 года па артыкулу а/а 74 (актыўная барацьба супраць рэвалюцыйнага руху). Атрымаў 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 30.11.80 г.

Кейзік Мікалай Якубавіч, 1912 г.н., з сялян, адукацыя 5 класаў, загадчык склада Пастаўскага леспрамгаса, месца жыхарства — вёска Кейзікі, меў жонку. Арыштаваны 31.10.1940, асуджаны 28.05.41г. Абвінавачваўся ў тым, што быў у КПЗБ, правакатар, супрацоўнічаў з польскай паліцыяй, выдаваў ёй рэвалюцыйна настроеных асоб. Па артыкулу а/а 74 атрымаў 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў. 12.09.41г., як польскі грамадзянін амнісціраваны і выбыў з месцаў зняволення ў Разанскую вобласць у горад Чкалаў. Рэабілітаваны 8.12.89г..

Казаровец Георгій (Жоржык)Уладзіміравіч у час танцаў у вёсцы Голбія скінуў партрэт Сталіна, атрымаў 1 год папраўча-працоўных лагераў, адсядзеў год, амніставаны ў сувязі са смерцю Сталіна. Па яго словах, каб ён наўмысна скінуў партрэт, атрымаў бы ўсе 25 год.

Пачкоўскі Аляксей Сямёнавіч, 1902 г.н., месца жыхарства — вёска Голбія, беларус, з сялян, 3 класы адукацыі, бракёр Варапаеўскага лясгаса; жонка і 3 непаўналетніх дзяцей. Арыштаваны 2. 12. 1940 г., асуджаны 12. 06. 1941 г. Абвінавачваўся ў тым, што быў грамадскім солтысам, канфідэнтам польскай паліцыі. Атрымаў 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў, знаходзіўся ў турме №1 Разанскай вобласці. 6. 09. 1941, як былы польскі грамадзянін, атрымаў пасведчанне ад амністыі і выбыў на жыхарства ў г. Бузулук Чкалаўскай вобласці. Рэабілітаваны 31. 10. 1989 г.

www.kamunikat.org

Жыхар вёскі Алашкаўшчына, аднавясковец Красоўскага Аркадзя, чалавек з гумарам, аднойчы дазволіў сабе такую фразу: «Дрэнна пры Сталіну жывецца. Вось з Гітлерам я сябраваў і жылося мне цудоўна.» Пра гэтыя словы данёс уладам адзін з вяскоўцаў. Жартаўнік атрымаў 25 год турэмнага зняволення. Вярнуўся праз 2 гады пасля смерці Сталіна.

2. Спіс людзей Галбейскага сельсавета, якія былі ў 1943 г. вывезены ў Германію (звесткі Глыбоцкага архіва)

Пятроўскі Канстнцін — в. Рагоўскія
Аліхвер Фадзей Мікалаевіч
Абалевіч Іосіф Вацлававіч
Павалковіч Казімір Антонавіч — в. Труплічы
Павалковіч Павел Францавіч — в. Труплічы
Павалковіч Іосіф
Янучкоўскі Вікенцій Казіміравіч — в. Альшнева
Янучкоўскі Вікенцій Лук'янавіч — в. Альшнева

З вёсак *Бартасоўшчына і Залессе*:
Балай Юзэф Аляксеевіч
Салавей Кляменцій Казіміравіч
Салавей Кларук Іпалітавіч
Салавей Ніна Іпалітаўна
Ясюковіч Павел Юльянавіч
Ясюковіч Фёкла Юльянаўна
Ясюковіч Тамара Юльянаўна
Кухальскі Юзэф
Кухальская Ганна Казіміраўна
Мішута Вікенцій Леонавіч
Данісевіч Стэфан Валер'янавіч
Лысёнак Ганна Адамаўна.
(Гэты спіс няпоўны, у асноўным прыводзяцца прозвішчы гаспадароў сем'яў).

3. Спіс забітых па Галбейскаму с/с:

Аліхвер Антон
Аліхвер Юля
(Спіс няпоўны).

4. Вытрымкі з пратаколу арганізацыйнага сходу па ўтварэнню калгаса імя Леніна ў в. Галбея.

Протокол
Общего собрания крестьян-единоличников дер. Голбея Голбейского с/с Дуниловического р-на, желающих объединиться в с/артель, от 18 октября 1949 г.

Присутствовало 45 человек.
Президиум собрания:
Председатель — Казаровец А.А.
Секретарь — Пачковский В.А.
Члены:
Пачковская София Б.
Синкевич Глафира.

Повестка дня:
1. Изучение и принятие устава с/артели.
2. Выборы руководящих органов:
а) председателя и правления;
б) ревкомиссии;
в) утверждение счетовода.

Слушали: Чтение примерного устава с/артели секретарем РКП(б) тов. Балыкиным М.М.

Постановили: Заслушав и обсудив примерный устав с/артели общее собрание крестьяне-единоличники в количестве 45 человек
а) объединяются в с/артель, чтобы общими средствами производства и общим организационным трудом построить коллективное общественное хозяйство, обеспечить полную победу над кулаком, над всеми эксплуататорскими элементами, над врагами трудящихся, над

www.kamunikat.org

нуждой и темнотой, над отсталостью мелкого единоличного хозяйства, создать высокую производительность труда, обеспечить таким образом лучшую жизнь колхозников.

б) с/артель назвать именем Ленина

в) установить размеры приусадебных земель, находящихся в личном пользовании колхозного двора, не считая земли под постройками, от 0,30 до 0,60 га.

Слушали: Выборы руководящих органов с/артели имени Ленина. В своем выступлении т. Галяш А.П. разъяснил, чтобы колхозники в руководящие органы выбрали лучших и честных людей.

Постановили: единогласно избрать председателем правления артели имени Ленина Пачковского Владимира Антоновича.

Постановили: единогласно избрать зам. пред. правления к-за Пачковского Иосифа И.

Слушали: т.Бондарева о засыпке семян и обобществлении тягловой силы и с/х инвентаря.

Постановили: Поручить правлению колхоза подобрать помещение для засыпки семян и также подобрать лучшее помещение для конюшни на более выгодном месте».

5. Дакумент аб выдзяленні зямлі калгасу імя Леніна ў вёсцы Голбія.

«Решение исполкома Дуниловического районного совета депутатов трудящихся от 5 ноября 1949 г. «Об утверждении земельного массива, отведенного вновь организованному колхозу им. Ленина в дер. Голбея Дуниловического р-на»

Всего земли	Леса	Усадебной	Пашни	Сенокоса	Выпаса
263 га	—	20 га	143 га	70 га	20 га

Председатель Исполкома Дуниловического Райсовета Депутатов Трудящихся *Ф.Тогилев».*

Мясцовыя назвы

Галбейшчына

Авячнікі
Адступнікі
Азярышча
Алесева кладка
Аліхверскае поле
Аліхверскі мшок
Аліхверы
Андрэеўка (месца за пераездам)
Аселіца (ад слова асяленне, ваколіца)
Астравок
Бальшак
Баравіна
Баракі
Бацянова гняздо (бацяноўка)
Буёк буйкі бярэзнік
Валатоўка (валатоўкі)
Вілкі
Вір
Военшчына
Вузкакалейка
Вусці (вусце)
Галбея (голбія)
Галбейскае возера
Галбяіца
Гарадзішча (Гарадзец)
Гарэльнік (месца пад балаямі, дзе гарэў лес)
Гліншчына
Глушка
Глушыца
Глыбокі роў
Града (месца пад Варапаевам, дзе бралі пясок для вырабаў на шклозаводзе)
Грамвальды
Грацоўка
Гута
Двор
Дворны луг (Дворнае Поле)
Дзірваны
Длінныя шнуры
Заазер'е (Заазер'е, Заазёр'е)
Зарэчча
Засып
Зайцова (Зайцава)
Задняе возера
Калягава дзялка
Камышы
Капанка

www.kamunikat.org

Капер
Карчы
Каршуноўка (Каршунова Гняздо)
Касцюкова
Качарга
Кіёўнік
Кладкі
Конская Зыгарада
Красны Бор (на гэтым месцы быў хутар, а ў час вайны гаспадар хаты дазваляў партызанам жыць тут. Немцы даведваліся пра гэта і спалілі хату разам з гаспадарамі.)
Кураед (куроід)
Леснічоўка
Лісічча
Лужок
Лучкі
Лысая гара
Ляда
Лядзінкі (Лядзянка)
Магілкі
Майдан
Мар'янскі каптур
Нарычнік (Нарышнік)
Падбаба (хутар)
Падлесіца
Паднавіны
Пад хаткамі
Палігон
Палінтоўка

Панскі двор
Пераезд
Плёсы
Пярэчкі
Пяскі
Пярэдняе возера
Ручальніца
Скотнік
Сталюгі
Старына
Сяліба
Сялішча
Таўсціца
Трумпічы
Хардакова
Хаткі
Царкавішча
Чарнічны лес
Чарэпнік
Чортаў мост
Чортка (Чарток)
Шалманы
Шкулка
Шурыца
Шурыцкі мост
Шырокія

Вёска Вайцяхі

Барок
Баркоўская ферма

Белятава
Бендасоўшчына
Вайцяхі (некалі на гэтым месцы пасялілася племя. Быў у ім адзін хлапец, які ўсім дапамагаў. Яго звалі Войцех. У гонар гэтага чалавека назвалі вёску)
Імшок
Калясо
Клёпішча
Лысая гара
Парк
Пяты гарадок
Рагоўскія
Трумпішчы
Трумпіцкае возера

Вёска Белькі

Апушка
Баравы лес
Барок
Белятава
Зашчыта
Круглае поле
Косаўшчына
Кладбішча
Кладкі
Камяняшчэ
Лэп
Олбшнева
Окны

Палавіца
Пагар
Таўсціца
Хутар
Хутар бронькаў
Ярышча

Вёска Куніцкія

Аступішча
Барок
Барсук
Бартасоўшчына
Бацяноўка
Біндасоўшчына
Візіра
Ельнік
Залессе
Залеські бор
Імшара
Клёпішча
Клін
Коззя гара
Крыніцы
Ліхое балота
Лысая гара
Марцінаўка
Мястэчка, дзе заяц смяецца
Невядомшчына
Паташня
Плавуча

www.kamunikat.org

Плісаўка
Сарвітут
Скурадная
Старая лінія
Старынка
Старынкавы бор
Ступішчы
Філюнеў хутар
Церабеж
Цімянец
Чарцяніха
Чырвоная імшара
Язюткавы дзялкі
Якімаўскае возера

Матэрыял падрыхтавала Аліхвер Л.У.

Крыніцы і літаратура

1. Археалогія і нумізматыка Беларусі. — Мінск: БелЭн, 1993. — 702 с.
2. Гошкевич И. Виленская губерния. Полный список населенных мест со статистическими данными. — Вильно, 1905.
3. Зайкоўскі Э. М. Справаздача пра палявыя археалагічныя даследванні 1998 года.
4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. — Мн.: БелСЭ, 1985. — 496 с.
5. Зямчонак І. Мястэчка пры гасцінцы. — Мінск: Беларусь-Інфарм-Сэрвіс, 1995. — 132 с.
6. Памяць. Пастаўскі раён. — Мінск: БЕЛТА, 2001. — 688 с.
7. Пракаповіч І. Крыжы і камяні: Нарысы па гісторыі Пастаўскага краю. — Маладзечна: УП «Друкарня «Перамога», 2003. — 56 с.: іл.
8. Пракаповіч І. М. Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна. — Віцебск, ІУН, 1994. — 50 с.
9. Сапунов А., Друцкий-Любецкий В. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии. — Витебск, 1896.
10. Матэрыялы Глыбоцкага архіва.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. — Мн.: БелЭн, 1993 — 2001.
12. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. — Мн.: БелСЭ, 1989. — 575 с.

www.kamunikat.org

ЗМЕСТ

Прадмова 4

Галбейшчына: прырода і людзі

Геаграфічнае становішча 7
Будова зямной кары і паверхні 8
Кліматычныя асаблівасці 11
Рэкі і азёры 14
Глебы, расліннасць, жывёльны свет 21
Паселішчы і насельніцтва 25

Вытокі

Сведкі старажытных часоў 29
Галбейскае таварыства 34
Ліхалецце першай сусветнай 38

Пад уладай Польшчы

Завод, дзе варылі шкло 41
Уладанні графа Пшаздзецкага 45
Надлесны і леснікі 47
Жыццёвыя праблемы 51
Хардакова 54

Ад верасня 1939 г. да чэрвеня 1941 г.

Першыя саветы 56

Другая сусветная вайна

Пачатак вайны 58
Партызанскі рух 59
Трагедыя Хардакова 64
Актывізацыя партызанскага руху 66
Акаўцы 68
Блакада 68
На работы ў Германію 69
Апошнія эпізоды вайны 71

Пасляваеннае жыццё

Падзел зямлі 72
Калектывізацыя 73

Дадаткі

1. Спіс рэпрэсаваных савецкай уладай у 1939–1941 гг. 77
2. Спіс людзей Галбейскага сельсавета, якія былі ў 1943 г. вывезены ў Германію (звесткі Глыбоцкага архіва) 78
3. Спіс забітых па Галбейскаму с/с: 79
4. Вытрымкі з пратаколу арганізацыйнага сходу па ўтварэнню калгаса імя Леніна ў в. Галбея. 79
5. Дакумент аб выдзяленні зямлі калгасу імя Леніна ў вёсцы Голбія. 80

Мясцовыя назвы 81
Галбейшчына 81
Вёска Вайцяхі 82
Вёска Белькі 83
Вёска Куніцкія 83

Крыніцы і літаратура 84

www.kamunikat.org

Фота на вокладцы Анатоля Курака

Літаратурна-мастацкае выданне

Арэх Мікалай Уладзіміравіч,
Пракаповіч Ігар Міхайлавіч

Гута-Голбія

гісторыка-геаграфічны нарыс Галбейскага краю

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *?*
Камп'ютэрны набор *?*
Камп'ютэрная вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктары *І. Міхневіч, ??*

Падпісана да друку 25.05.2007 г. Фармат 84х108 $^{1}/_{32}$
Друк на рызографе. Папера афсетная. Гарнітура Times.
Ул.-выд. 2,89 арк. Ум. друк. 4,62 арк.
Наклад 300 асобнікаў. Зак. ?.

ПУП «Кнігазбор».
Ліцэнзія № 02330/0131712 ад 12.05.06.
220112, Мінск, вул. Я. Лучыны, 38-93.
Тэл./факс (017) 204-86-97,
тэл. (029) 772-19-14, 912-83-86.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
ў друкарні УП «Ходр» БелТІЗ.
Ліцэнзія ЛП № 02330/0056661 ад 29.03.04.
220004, г. Мінск, вул. Вызвалення, 9.

www.kamunikat.org